Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

25 ЧЭРВЕНЯ 2016 г. СУБОТА № 120 (28230) Кошт 2400 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## АСАБЛІВАЯ МІСІЯ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка павіншаваў юнакоў і дзяўчат краіны з Днём моладзі**

«Сёння грамадства ўскладае на вас вялікія надзеі, бо новае аблічча эканомікі, культурнага і грамадскага жыцця краіны шмат у чым будзе залежаць ад арганічнага ўключэння маладога пакалення грамадзян у вырашэнне самых адказных і складаных задач», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Прыемна бачыць, што ў нас актыўная, думаючая моладзь, неабыякавая да будучыні роднай Беларусі. Многія з вас дасягаюць поспехаў у вучобе і працы, творчасці і спорце, паказваюць прыклад міласэрнасці і гуманізму», — адзначыў Прэзідэнт.

Дзяржава робіць усё магчымае для таго, каб кожны малады чалавек змог выбраць свой прафесійны шлях, пабудаваць шчаслівае жыццё і прымяніць здольнасці на карысць Радзімы, гаворыцца ў віншаванні.

## *ЦЫТАТА ДНЯ*

**Вадзім ІАСУБ, фінансавы аналітык:**

*«Я не раіў бы рабіць нейкія маніпуляцыі з валютнымі зберажэннямі на фоне змяненняў курсаў долара і еўра ў сувязі з вынікамі рэферэндуму па выхадзе Вялікабрытаніі з Еўрасаюза. Адназначна зараз нічога рабіць не варта. Тыя курсы, якія цяпер устанавіліся, — гэта вынік павышанай валацільнасці. Наогул, калі гаварыць аб валютных зберажэннях, то заўсёды мэтазгодна захоўваць сродкі ў некалькіх валютах, напрыклад, у доларах і еўра або ў доларах, еўра і расійскіх рублях. Тады ў выпадках, падобных да сённяшняга, адна частка зберажэнняў таннее, але гэта кампенсуецца тым, што іншая частка даражэе».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.06.2016 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 20051,00 ▲ |
| Еўра | 22271,00 ▼ |
| Рас. руб. | 306,57 ▼ |
| Укр. грыўня | 806,39 ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Маладыя!

## Заўтра — Дзень моладзі

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Абітурыент-2016

## ТАЙНА ЗА СЯМЮ ПЯЧАТКАМІ

### ШТО АДБЫВАЕЦЦА З РАБОТАМІ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ ЦТ?

**Цэнтралізаванае тэсціраванне набліжаецца да свайго завяршэння. Большая частка абітурыентаў ужо «адстралялася» — у графіку ЦТ засталося ўсяго некалькі дысцыплін. Праўда, застаецца яшчэ рэзервовы дзень — для тых, хто прапусціў экзамен з уважлівай прычыны. Парушальнікі правілаў ЦТ і абітурыенты, якія спазніліся на тэсціраванне без уважлівай прычыны, пераздаць тэсціраванне ў рэзервовы дзень не змогуць, а значыць, яны засталіся за бортам прыёмнай кампаніі. Найбольшая колькасць «прагульшчыкаў» была зарэгістравана традыцыйна на самых масавых дысцыплінах — рускай мове і матэматыцы.**

### Сакрэт дзяржаўнага значэння

Першыя вынікі ўдзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання з'явіліся ўжо ўчора. У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў «горача» як ніколі — да пачатку прыёму дакументаў трэба не толькі паспець праверыць работы ўсіх удзельнікаў ЦТ, але і перадаць сертыфікаты ў пункты правядзення тэсціравання.

СТАР. 5

■ Прагнозы

## Медыкі, эколагі, цырульнікі

### Якія прафесіі будуць запатрабаваныя праз пяць гадоў

**«Столькі вучыўся, а нікуды не магу ўладкавацца», — наракаюць некаторыя выпускнікі. Штогод частка моладзі не знаходзіць сабе работу па спецыяльнасці і ідзе працаваць па прынцыпе «куды возьмуць». Якія прафесіі выбраць сённяшнім абітурыентам, каб пасля вучобы быць запатрабаванымі на рынку? І хто ж са спецыялістаў у 2020 годзе аказацца не пры справе? Разбіраемся разам з экспертамі.**

### У прыярытэце — высоканавуковыя тэхналогіі

Адной з самых запатрабаваных прафесій застануцца медыкі, лічыць **начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алег ТОКУН.**

— З аднаго боку расце працягласць жыцця, пажылых становіцца больш, з іншага — павялічваецца нараджальнасць, — тлумачыць устойлівы попыт на ўрачоў эксперт. — Гэтыя ж прычыны, дарэчы, будуць абумоўліваць і патрэбу ў работніках сацыяльнай сферы. Плюс у Беларусі развіваецца экспарт медыцынскіх паслуг, да нас актыўна едуць лячыцца замежнікі.

Будуць у трэндзе прадаўцы і спецыялісты сферы паслуг: цырульнікі, афіцыянты. Гэта прафесіі, дзе камп'ютар не зможа замяніць чалавека, таму патрэба ў такіх кадрах не знікне. Застануцца творчыя прафесіі, але пры гэтым варта разумець, што попыт на іх заўсёды невялікі. І конкурс у нашы ВНУ на творчыя спецыяльнасці гэта пацвярджае.

— У прыярытэце — развіццё высоканавуковых тэхналогій, а значыць будуць неабходны айці-спецыялісты (ад тэсціроўшчыкаў да праграмістаў) і інжынеры. У сувязі з будаўніцтвам атамнай станцыі перспектыўным кірункам стане ядзерная энергетыка, тым больш, што кваліфікаваных работнікаў у гэтай галіне ў Беларусі пакуль няшмат, — дадае Алег Токун.

Калі казаць пра сельскую мясцовасць, то там заўсёды быў попыт на аграномаў, ветэрынараў, механізатараў, трактарыстаў. Ён захаваецца, хоць і ў меншай ступені. У вёску таксама прыходзіць аўтаматызацыя, і там, дзе раней на ферме было занята 40-50 чалавек, цяпер дастаткова шасці.

У цэлым, мяркуе прадстаўнік міністэрства, будуць неабходны прафесіі, якія патрабуюць творчага асэнсавання, а не механічнага выканання дзеянняў.

### Спецыялісты па тэндэнцыях

Два гады таму ў «Сколкава» выпусцілі «Атлас будучых прафесій». Па ацэнках даследчыкаў, якія складалі даведнік, да 2020 года на біржы з'явіцца больш за 120 новых спецыяльнасцяў. Многія з іх будуць звязаны з экалогіяй: урбаніст-эколаг (яго задача — праектаваць высокатэхналагічныя «зялёныя» гарады), спецыяліст па пераадоленні сістэмных экалагічных катастроф (гэта катастрофы, працяглыя ў часе, якія ўсведамляюцца людзьмі паступова, напрыклад забруджванні вакол буйных прамысловых цэнтраў, радыяцыйныя звалкі), спецыяліст па рэцыклінгу адзення, экааналітык у здабыўных галінах.

СТАР. 4

# СТАЦЬ «ПАЛЯВЫМ ІГРАКОМ»

## У супрацоўніцтве з ШАС наша краіна не будзе назіраць з «лаўкі запасных»

**Завяршыўся рабочы візіт Аляксандра Лукашэнкі ў Ташкент. У сталіцы Узбекістана Прэзідэнт прыняў удзел у пасяджэнні савета кіраўнікоў дзяржаў — членаў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Гэта быў першы саміт ШАС, у якім Беларусь прыняла ўдзел на вышэйшым узроўні ў новым статусе назіральніка.**

Аляксандр Лукашэнка і Сі Цзіньпін. Фота БЕЛТА.

У сваім выступленні на саміце беларускі лідар заявіў аб намеры Беларусі актыўна ўдзельнічаць у рабоце арганізацыі па ўсіх кірунках, якія маюць узаемны інтарэс. «Цвёрда перакананы ў тым, што ШАС з'яўляецца запатрабаванай перагаворнай пляцоўкай для калектыўнай выпрацоўкі механізмаў процідзеяння сучасным выклікам і пагрозам», — адзначыў ён.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, другім магістральным напрамкам узаемадзеяння ў рамках ШАС павінна стаць эканамічная кааперацыя. Кіраўнік беларускай дзяржавы зрабіў акцэнт і на неабходнасці ўзаемадзеяння Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва з Еўразійскім эканамічным саюзам.

«Як краіна-назіральнік у ШАС мы не збіраемся, гаворачы спартыўнай тэрміналогіяй, сачыць за гульнёй з «лаўкі запасных». Беларусь гатова стаць актыўным «палявым ігракам» на прасторы арганізацыі і ўнесці важкі ўклад у яе работу», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

У Ташкенце таксама адбыліся двухбаковыя перагаворы беларускага лідара са Старшынёй КНР і прэм'-ер-міністрам Індыі. Бакі абмеркавалі пытанні па развіцці гандлёва-эканамічнага, навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва, рэалізацыі перспектыўных праектаў.

Падчас сустрэчы з Сі Цзіньпінам кіраўнік беларускай дзяржавы запэўніў, што як Кітай, так і ШАС у цэлым могуць разлічваць на падтрымку Беларусі ў любых пытаннях. «Мы гатовы быць «заходнімі варотамі» гэтай арганізацыі», — заявіў беларускі лідар. У якасці прыкладу таго, як Беларусь паслядоўна выконвае ўзятыя на сябе абавязацельствы, Аляксандр Лукашэнка прывёў рэалізацыю праекта па стварэнні Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень». «Як вы яго назвалі, гэта жамчужына Вялікага шаўковага шляху. Мы будзем рабіць усё і робім цяпер, каб гэты праект быў напоўнены эканамічным зместам», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

У сваю чаргу Сі Цзіньпін павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з паспяховым правядзеннем пятага Усебеларускага народнага сходу і адзначыў, што беларуска-кітайскія адносіны імкліва набіраюць абароты, і па ўсіх пытаннях бакі падтрымліваюць адзін аднаго. Сі Цзіньпін таксама выказаў падтрымку намаганняў, нацэленых на спакойнае правядзенне парламенцкіх выбараў у нашай краіне. Ён запрасіў Аляксандра Лукашэнку наведаць Кітай з дзяржаўным візітам і заявіў аб гатоўнасці далейшага паглыблення супрацоўніцтва па ўсіх кірунках.

На сустрэчы з прэм'ер-міністрам Індыі Нарэндра Дамадардасам Модзі Аляксандр Лукашэнка заявіў, што беларуска-індыйскім адносінам неабходна надаць дадатковы імпульс. «У нас ёсць добрыя кірункі супрацоўніцтва, але я лічу, што на гэтым спыняцца нельга. Трэба рухацца наперад. І мы, вядома ж, чакаем вашай большай прысутнасці ў цэнтры Еўропы. Для вялікай Індыі гэта будзе нядрэнна, і мы гатовы рэалізаваць вашы інтарэсы ў Беларусі настолькі, наколькі гэта вам выгадна», — сказаў беларускі лідар.

**Паводле БЕЛТА.**

■ Парламенцкі дзённік

# ЦІ СТАНЕ БОЛЬШ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЯЎ?

## ПРЫНЯТЫ ПРАЕКТ КОДЭКСА, АНАЛАГАЎ ЯКОМУ НЯМА Ў СВЕЦЕ

**Учора дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу ў другім чытанні прынялі праект Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры. Ён будзе рэгуляваць грамадскія адносіны ў сферы культуры па такіх напрамках, як творчая дзейнасць, ахова гісторыка-культурнай і археалагічнай спадчыны, бібліятэчная і музейная справа, народныя мастацкія рамёствы, кінематаграфічная дзейнасць, арганізацыя і правядзенне культурных мерапрыемстваў... Гэты дакумент — унікальны не толькі для нашай краіны. Яму, як адзначаюць распрацоўшчыкі, увогуле няма аналагаў у свеце.**

Праект Кодэкса аб культуры складаецца з Агульнай і Спецыяльнай частак, пяці раздзелаў, 257 артыкулаў.

**Наталля КУЧЫНСКАЯ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы,** у размове з карэспандэнтам «Звязды» паведаміла, што да таго, як Кодэкс запрацуе, ён павінен быць прыняты Саветам Рэспублікі і падпісаны Прэзідэнтам.

— Дакладна сказаць, калі ён пачне дзейнічаць, не магу, але ўпэўнена, што гэта адбудзецца сёлета — бо зараз Год культуры, — сказала Наталля Кучынская. — Так што ў 2017 годзе Кодэкс ужо будзе працаваць.

У праекце Кодэкса вызначаны змест дзяржаўнай палітыкі і кампетэнцыя дзяржаўных органаў у сферы культуры. Так, сёння напрамкамі дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры з'яўляюцца: стварэнне ўмоў для супрацоўніцтва дзяржаўных органаў з камерцыйнымі арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, прыцягненне сродкаў спонсараў і мецэнатаў культуры, іншых юрыдычных асоб і грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў... У той жа час захоўваецца фінансаванне сферы культуры за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў.

Кодэкс спрашчае парадак прыняцця некаторых кіраўніцкіх рашэнняў. У прыватнасці, да кампетэнцыі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў абласнога ўзроўню аднесена прыняцце рашэнняў аб наданні культурным каштоўнасцям, якія маюць значнасць для асобнага рэгіёна, статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці, а таксама прыняцце рашэнняў аб пазбаўленні іх такога статусу.

Адказваючы на пытанне пра тое, ці стане ў сувязі з гэтым новаўвядзеннем больш аб'ектаў са статусам гісторыка-культурнай каштоўнасці, Наталля Кучынская выказала спадзяванне, што такіх аб'ектаў павінна прыбавіцца:

— Людзі ў сферы культуры актыўныя. Увогуле, гэта вельмі важны нюанс: у кожным рэгіёне ёсць значныя культурныя аб'екты.

Яшчэ адно новаўвядзенне — у праекце Кодэкса прадугледжаны больш сур'ёзныя патрабаванні да стварэння музеяў. Абавязковае патрабаванне — магчымасць увядзення штатнай адзінкі (адзінак) музейнага работніка. Спрашчаецца парадак стварэння музеяў-запаведнікаў і музеяў пад адкрытым небам: не патрабуецца прыняцця рашэнняў Прэзідэнта або Савета Міністраў.

У сваім выступленні ў авальнай зале дэпутат Наталля Кучынская звярнула ўвагу і на тое, што ў Кодэксе прадугледжана магчымасць вяртання ўваходных білетаў «у выпадку змянення складу ўдзельнікаў ці змянення месца і часу правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства». Кампенсацыя кошту білета ў поўным памеры будзе выплачвацца не пазней чым за сем каляндарных дзён з дня падачы заявы.

### Карыстацца авіямадэлямі стане прасцей

Учора дэпутаты ўхвалілі змены і дапаўненні і ў іншы грунтоўны дакумент. Пра новаўвядзенні ў Паветраны кодэкс нашай краіны расказала **Алена БЕРАСНЕВА, член Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце.**

— На практыцы спрашчаецца выкарыстанне авіямадэляў у паветранай прасторы, іх не трэба будзе рэгістраваць, гэта значыць, усё будзе нашмат прасцей, — паведаміла парламентарый. — Пасля таго, як мы прымем адпаведныя змены ў заканадаўства, выкарыстанне авіямадэляў будзе рэгламентавацца не Паветраным кодэксам нашай краіны, а правіламі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, якія зараз распрацоўваюцца.

### Дадатковыя паўнамоцтвы

**Алег СЛІЖЭЎСКІ, міністр юстыцыі,** расказаў пра змены ў Закон «Аб адвакатуры і адвакацкай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь.

— Законапраектам прапануецца дэ-юрэ замацаваць такія прынцыпы арганізацыі адвакатуры, як самакіраванне і самафінансаванне, а таксама адзінства статусу адвакатаў, — адзначыў ён. — Сёння рэспубліканская калегія адвакатаў фармальна аб'ядноўвае ўсіх членаў калегіі, але не мае такіх кіруючых паўнамоцтваў, як тэрытарыяльныя калегіі. Таму неабходна павысіць ролю рэспубліканскай калегіі адвакатаў, якая павінна не толькі каардынаваць работу тэрытарыяльных калегій адвакатаў, але і здзяйсняць аператыўнае кіраванне некаторымі пытаннямі дзейнасці ўсёй адвакатуры ў краіне.

### Бюджэт прыйдзецца карэктаваць

Парламентарыі разгледзелі шэраг законапраектаў, прысвечаных зацвярджэнню справаздач аб выкананні бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў. Адказваючы на пытанне дэпутата Валянціны Ляоненкі, члена Пастаяннай камісіі па міжнародных справах, **Уладзімір АМАРЫН, міністр фінансаў,** прызнаў, што сёлета, на жаль, нестабільнасць знешніх фактараў, змяненне цэн на нафту ўплываюць на выкананне бюджэту.

— Нам прыйдзецца яго карэктаваць па выніках першага паўгоддзя, таму што цэны на нафту не адпавядаюць прагнозным значэнням, ёсць і іншыя адхіленні, — паведаміў міністр фінансаў. — Мы ўжо зарэзервавалі частку расходаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў для таго, каб збалансаваць бюджэт з улікам умоў, што змяняюцца.

Па словах міністра, меры па дадатковым прыцягненні ў бюджэт даходаў прынятыя. Уладзімір Амарын запэўніў, што бюджэт збалансаваць атрымаецца.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Тры пытанні да ўлады

# Неглюбка стала брэндам

**Больш чым на палову скараціласа насельніцтва Веткаўшчыны з сумна вядомага 1986 года. Самы набліжаны да Гомеля райцэнтр, як і ўвесь раён, моцна пацярпеў ад наступстваў Чарнобыля. Тым не менш сёння можна ўпэўнена казаць, што раён перайшоў ад пераадолення наступстваў аварыі да дынамічнага развіцця. Тут ёсць пэўныя поспехі, якімі ганарацца тыя, хто тут жыве і працуе. У апошні час сродкі скіраваны на развіццё сельскай гаспадаркі. Уведзены ў эксплуатацыю жывёлагадоўчыя комплексы ў Янове, Тарасаўцы, Неглюбцы і Хальчы, вядзецца будаўніцтва птушкафабрыкі магутнасцю 20 тысяч тон у год. Флагманам у раёне з'яўляецца СВП «Свяцілавічы». Летась прадпрыемства заняло першае месца па гаспадарча-эканамічнай дзейнасці ва ўсёй рэспубліцы. Старшыня Веткаўскага раённага выканаўчага камітэта Алег АРХІПЕНКА нядаўна заняў сваю пасаду. Ён падкрэслівае, што толькі дзякуючы арганізацыі працы раён паступова становіцца лідарам у сельгасвытворчасці. Пры гэтым нагадвае, што бал урадлівасці глебы ў раёне нізкі — 28. І ўсё ж летась веткаўчане занялі трэцяе месца ў вобласці па выхаду збожжа з аднаго бала гектара і другое — па нарыхтоўцы кармоў на ўмоўную галаву.**

***— Ведаю, што дагэтуль Веткаўскі раён не поўнасцю газіфікаваны. Што робіцца ў гэтым напрамку?***

— За постчарнобыльскі перыяд у раёне падведзены прыродны газ у самой Ветцы і 14 сельскіх населеных пунктах — пракладзена амаль 300 км газавых сетак. Аднак праблема газіфікацыі прыродным газам вырашана не паўсюль. Патрэбна працягваць газазабеспячэнне паўночна-ўсходняй часткі раёна. Там знаходзяцца чатыры аграгарадкі: Неглюбка, Янова, Малыя Нямкі і Стаўбун. Калі атрымаецца правесці газіфікацыю, якая прадугледжана Дзяржпраграмай па пераадоленні наступстваў катастрофы, будуць вырашаны і задачы паляпшэння экалагічнага становішча раёна за кошт выкарыстання чыстага паліва, стварэння неабходных санітарна-бытавых умоў пражывання. У Свяцілавічах сёлета плануецца газіфікаваць 80 дамоў. Між тым у самім райцэнтры трэба правесці рэканструкцыю каналізацыі і ачышчальных збудаванняў. Патрабуе рэканструкцыі і сістэма водазабеспячэння раёна. Цяпер за асабістыя сродкі мясцовы КЖРУП робіць рамонт каля 300 метраў водаправода ў аграгарадку Старае Сяло. Многім аб'ектам інфрастуктуры горада Ветка сёння патрэбна аднаўленне. Запланавана правесці рамонт гарадскога дома культуры, аддзяленняў радзільнага і рэабілітацыі раённай бальніцы. Прыйшло ў непрыгоднасць і дзіцячае аддзяленне, якое патрабуе сур'ёзнай рэканструкцыі. На сёлета запланавана правесці рамонт дзіцячага садка, дзе цяпер выхоўваецца каля 60 дзетак.

***— Як вырашаецца праблема занятасці ў райцэнтры, да якога дабірацца 20 хвілін на маршрутцы?***

— На сённяшні дзень у нас вакансій больш, чым тых, каму яны патрэбны. У раёне патрэбны настаўнікі, супрацоўнікі аховы здароўя, праваахоўнікі. Да нас штодзень прыязджаюць на працу многія спецыялісты, у тым ліку і кіраўнікі, з Гомеля. Жыхары абласнога цэнтра запаўняюць вакансіі ўрачоў, настаўнікаў, міліцыянераў, а вось мясцовыя чамусьці ад'язджаюць у горад. Гэта агульная тэндэнцыя малых гарадоў. Многія лічаць, што толькі ў вялікіх гарадах ёсць жыццё, а ў вёсках людзі дажываюць. Хоць мне здаецца, гэта не так. Сёння ў нас на месцах ёсць усё неабходнае: добрая заработная плата, жыллё і ўся неабходная інфраструктура. Дарэчы, тыя, хто мае жыццёвы вопыт, не імкнуцца ў горад — наадварот.

***— Веткаўскі музей старажытнасці і беларускіх традыцый ведаюць далёка за межамі раёна, вобласці і нават Беларусі. Але ж зусім нядаўна ў спіс гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі трапілі неглюбскія тэкстыльныя традыцыі. Хаця, здаецца, знаўцы заўсёды захапляліся ручнікамі вытворчасці майстроў з вёскі Неглюбка.***

— Так, вельмі прыемна, што на агульнадзяржаўным узроўні неглюбскія белачырвоныя ручнікі прызнаны брэндам Беларусі. Рашэнне па прысваенні такога статусу было прынята Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай радай па пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Тэкстыльныя традыцыі вёскі Неглюбка — унікальная з'ява беларускай народнай творчасці, якія з'яўляюцца візітнай карткай краіны. Багацце і разнастайнасць тэхнік ткацтва і вялікі арнаментальны фонд — адметныя асаблівасці ручніка з Неглюбкі. Майстры выкарыстоўваюць некалькі дзясяткаў складаных геаметрычных і раслінных арнаментаў. Адметная тэкстыльная традыцыя ў вёсцы сёння не толькі існуе, але і актыўна развіваецца. Сучасныя майстры навучаюць малодшае пакаленне характэрным для неглюбскай традыцыі тэхналогіям у гуртках, арганізаваных пры Неглюбскім сельскім цэнтры ткацтва, у неглюбскай школе, у гуртку ткацтва Веткаўскага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*

# На ўсе пытанні будуць дадзены адказы

## Падведзены вынікі работы «гарачай лініі» падчас Усебеларускага сходу

**За два дні работы «гарачай лініі» падчас пятага Усебеларускага народнага сходу было разгледжана больш за паўтысячы зваротаў. Большасць з іх тычылася жыллёва-камунальнай гаспадаркі, будаўніцтва і жылля, сацыяльнага забеспячэння, працоўных адносін, аховы здароўя, аграпрамысловага комплексу.**

Фота БЕЛТА.

«Усе пытанні, якія паступілі ў гэтыя два дні, накіраваныя ў адпаведныя дзяржаўныя органы для разгляду. Хачу адзначыць, што кожнаму, хто датэлефанаваўся, будуць дадзены адказы ва ўстаноўленыя тэрміны. Ні адзін званок, ні адзін зварот не застанецца без увагі», — сказаў **Аляксей ЦВЯТКОЎ, кіраўнік «гарачай лініі».** Паводле яго слоў, за час работы лініі паступіла 538 зваротаў. У разрэзе рэгіёнаў яны размеркаваліся наступным чынам: Мінск — 208, Мінская вобласць — 84, Брэсцкая і Гомельская — па 55, Магілёўская — 48, Віцебская — 47, Гродзенская — 41.

Большасць зваротаў на «гарачую лінію» паступіла ад жыхароў сталіцы. Па словах **Андрэя ШОРЦА, старшыні Мінгарвыканкама,** мінчан поруч з іншымі пытаннямі цікавілі і звязаныя з сацыяльным забеспячэннем. Так, у сталіцы да 1 ліпеня будзе здадзена дзіцячая паліклініка ў Каменнай Горцы, да канца года — дарослая, а дзіцячая — у Брылевічах, таксама новы корпус дзіцячай інфекцыйнай бальніцы. Што тычыцца ўстаноў адукацыі, то да канца года плануецца адкрыць два дзіцячыя садкі ў Каменнай Горцы, адзін — у Маскоўскім раёне і школу ў Масюкоўшчыне.

Большасць пытанняў, якія паступілі на «гарачую лінію» — каля 100 — тычылася ЖКГ. Як паведаміў **Аляксандр ЦЕРАХАЎ, міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі,** адзін з блокаў такіх зваротаў звязаны з прыватызацыяй жылля. Па словах міністра, цяпер у прыватнай уласнасці знаходзіцца больш за 95% жылля, прыватызавана 1,5 мільёна кватэр. «З выхадам указа №563 вызначана, што з 1 ліпеня ўсе жылыя памяшканні дзяржаўнага жыллёвага фонду пераходзяць у арэнднае жыллё. У сувязі з завяршэннем прыватызацыі ўрадам быў распрацаваны план мерапрыемстваў, якім прадугледжана апавяшчэнне ўсіх наймальнікаў дзяржаўных кватэр, якія маюць права на прыватызацыю. Акрамя таго, забяспечаны прыём дакументаў у чэрвені ў будныя і выхадныя дні да 20.00, у апошні тыдзень месяца — з 6.00 да 24.00. Такім чынам створаны ўмовы, каб грамадзяне, якія па якіх-небудзь прычынах не змаглі падаць заяву, змаглі гэта зрабіць», — падкрэсліў Аляксандр Церахаў.

**Уладзімір ПАТУПЧЫК, міністр энергетыкі Беларусі,** адзначыў, што ў яго галіне паступіла 18 зваротаў, і асобна закрануў пытанні, звязаныя з разлікамі за газ і электраэнергію для асобных катэгорый грамадзян — пенсіянераў. «Летам яны з'язджаюць з гарадоў у сельскія населеныя пункты, дзе жывуць у набытых або атрыманых па спадчыне дамах, у якіх ніхто не зарэгістраваны. Варта адзначыць, што парадак аплаты насельніцтвам паслуг электра- і газазабеспячэння рэгулюецца пастановай Саўміна, у якой прапісана, што тарыфы, якія субсідзіруюцца дзяржавай, на ўказаныя паслугі прымяняюцца па асноўным месцы жыхарства для ўсіх катэгорый грамадзян без выключэнняў. Неабходнасць увядзення такога парадку абумоўлена наяўнасцю ў асобных грамадзян двух і больш жылых памяшканняў, дзе ніхто не зарэгістраваны. У такіх выпадках электраэнергія і газ аплачваюцца па тарыфах, якія забяспечваюць поўнае пакрыццё эканамічна абгрунтаваных затрат», — растлумачыў ён. Але нагадаў, што для асобных катэгорый грамадзян, у тым ліку для непрацуючых пенсіянераў, існуюць выключэнні. Варта толькі часова зарэгістравацца праз сельсавет, на тэрыторыі якога знаходзіцца лецішча...

**Анатоль ЧОРНЫ, міністр архітэктуры і будаўніцтва,** паведаміў, што для шматдзетных сем'яў, якія будуюць індывідуальнае жытло, будуць адшуканы сродкі для дадатковага крэдытавання. Такое рашэнне, па яго словах, было прынята прэм'-ер-міністрам. Для гэтага спатрэбіцца выдаткаваць 450 мільярдаў рублёў, якія яшчэ належыць адшукаць. Таксама шэраг пытанняў тычыўся і сферы медыцыны, у асноўным — лекавага забеспячэння. Напрыклад, аб незарэгістраваных у краіне леках і забеспячэнні ферментазамяшчальнай тэрапіі пацыентаў з рэдкімі генетычнымі захворваннямі, паведаміў **міністр аховы здароўя Васіль ЖАРКО.**

**Міністр працы і сацыяльнай абароны Беларусі Марыяна ШЧОТКІНА** заявіла, што павышэння пенсій беларусам варта чакаць у другім паўгоддзі (пра гэта паступалі пытанні на «гарачую лінію»). Таксама звярталіся і з прапановамі зрабіць надбаўку да пенсіі доўгажыхарам — старэйшым за 90 гадоў, што, па словах міністра, будзе разгледжана, а таксама «дзецям вайны», што разглядаць не плануецца. Акрамя таго, на лінію паступіла прапанова 2017 год зрабіць Годам сям'і. «Цудоўная прапанова. Мы яе абавязкова разгледзім», — адзначыла міністр.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

■ Меркаванні

# ГАЛОЎНАЕ — НЕ ПАРУШЫЦЬ РАЎНАВАГУ

**Міхаіл ВІШНЕЎСКІ, загадчык кафедры філасофіі МДУ імя Куляшова:**

— Усебеларускі народны сход — вельмі станоўчая і важная падзея. Гэта магчымасць зноў выверыць курс, пазіцыі шырокіх слаёў беларускага народа. Я слухаў фрагменты даклада Прэзідэнта і ўважліва прачытаў яго цалкам. Вельмі канструктыўная галоўная думка — пазбягаць непрадуманых крокаў, рэфарматарскага свербу. Калі нешта паспешліва ламалася, неабдумана ўводзілася ў дзеянне, узнікала шмат праблем. Вынік атрымліваўся не той, які чакалі. Асабліва небяспечна паспешлівасць у сферы адукацыі. Спробы прыхапкам нешта радыкальна перайначыць, вельмі небяспечныя пры рабоце з дзецьмі. Бо тут наша будучае закладваецца. Тут кожны крок павінен быць добра прадуманы і ўзважаны. Добрыя падручнікі не нараджаюцца хутка. Новыя падыходы ў адукацыі наогул не павінны нараджацца хутка, яны павінны быць апрабаваны. Агульная настроенасць кіраўніка дзяржавы стрымліваць рэфарматарскі запал мне здаецца вельмі слушнай.

Зразумела, што эканоміка краіны апынулася ў няпростым становішчы не па нашай віне. Тут адбіваецца цяжкая спадчыннасць мінулага. Раптоўна, у адно імгненне лідарам не станеш. Калі размова ідзе пра лідарства той жа Еўропы, то трэба прызнаць, што за гэтым стаяць стагоддзі развіцця ў асаблівых умовах. Напрыклад, каланіяльныя імперыі, якія заклалі аснову багацця значнай часткі сённяшніх еўрапейскіх краін. Стартавыя ўмовы спрыяльныя для гэтай групы краін ствараліся не сёння. У Беларусі нічога такога за плячыма няма. Яна ніколі не была імперскай дзяржавай, не выцягвала сокі ні з Афрыкі, ні з Амерыканскага кантынента. Таму нельга разлічваць на тое, што мы вельмі хутка выйдзем на ўзровень еўрапейскіх краін, якія свае багацці будавалі на няшчасці цэлых народаў. Успомніце, маленькая Бельгія і вялікае бельгійскае Конга, невялікая Галандыя і велізарная Інданезія, якая ў свой час стала яе калоніяй. Іспанія — і палова амерыканскага кантынента. Такія рэчы не трэба забываць, калі кажам пра сённяшні дзень. Я ўжо маўчу пра французскую, англійскую каланіяльныя імперыі. У нас сапраўды розныя стартавыя магчымасці.

Галоўнае, пераўтварэннямі не ўзарваць раўнавагу, не парушыць грамадскай згоды. Для таго, каб зрабіць рывок і наблізіцца да сусветных лідараў у эканоміцы, трэба вялікае напружанне сіл, а гэта стварае пэўныя рызыкі. Ва ўмовах грамадскага расколу ніякія эканамічныя задачы не будуць вырашаны. Перш за ўсё трэба, каб наша цэласнасць як беларускага народа была захавана. Калі той жа Кітай пераадольваў катастрафічнае становішча, у якім ён апынуўся, адбілася гэтая глыбінная ідэя, якая аб'яднала кітайскі народ. Нягледзячы на тое, што кітайцам прыйшлося прайсці складаны шлях, яны засталіся аптымістамі. І нам трэба браць з іх прыклад. Галоўнае не страціць адчування адзінства, нацыянальнай цэласнасці, нацыянальнай годнасці.

**Тамара ДАЎГАШЭЙ, галоўны ўрач Гродзенскага абласнога клінічнага кардыялагічнага цэнтра, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці:**

— Што тычацца развіцця медыцыны, Прэзідэнт агучыў тыя задачы, якімі мы займаемся ўжо цяпер. Гэта развіццё фармацэўтычнага рынку — прасоўванне айчынных лекавых сродкаў і стварэнне іх свабоднага руху на тэрыторыі Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Я магу як доктар канстатаваць, што якасць айчынных лекаў належная, і субстанцыі, з якіх іх робяць, закупляюцца ў адным і тым жа месцы і заходнееўрапейскімі канцэрнамі, і нашымі беларускімі фармацэўтычнымі прадпрыемствамі. Якасць належная, а суадносіны кошту і якасці аптымальныя. Таксама зараз актыўна адбываецца развіццё першаснай медыка-санітарнай дапамогі, сістэмы ўрачоў агульнай практыкі, сямейнага ўрача, памочніка доктара і ў прынцыпе ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай і кадравай базы амбулаторна-паліклінічных устаноў. У цэлым, у ідэале, чалавек павінен атрымаць дыягнастычную дапамогу ў той медыцынскай установе, у якую ён звярнуўся перш-наперш. А правесці якасную дыягностыку можна і ў амбулаторна-паліклінічных установах, калі яны належным чынам аснашчаныя. Гэта б значна разгрузіла месцы ў стацыянарах, якія б заставаліся для экстраннай паталогіі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, Вераніка ПУСТАВІТ.**

■ Прыярытэты

# ГОНАР КРАІНЫ

## Афіцэрскі корпус вышэйшага звяна папоўніла больш як сто чалавек

**Адбыўся чарговы выпуск слухачоў Генеральнага штаба Узброеных Сіл і выпускнікоў камандна-штабнога факультэта Ваеннай акадэміі Беларусі.**

— Гэтая падзея яшчэ раз пацвярджае правамернасць стварэння ўласнай сістэмы ваеннай адукацыі ў Беларусі, якая паказвае сваю высокую эфектыўнасць, — адзначыў **міністр абароны генерал-лейтэнант Андрэй РАЎКОЎ.** — У гэтым страі стаяць людзі, для якіх служэнне Айчыне стала найвышэйшай узнагародай і сэнсам жыцця. Людзі, якія сваім прафесіяналізмам і бездакорнай службай заслужылі права кіраваць калектывамі, а значыць прымаць рашэнні і несці адказнасць перад усім беларускім народам.

Міністр нагадаў, што традыцыйна выпуск адбываецца напярэдадні галоўнага свята беларускай дзяржаўнасці — Дня Незалежнасці. «Незалежнасць краіны — гэта вялізная адказнасць за забеспячэнне яе бяспекі, — звярнуўся да выпускнікоў кіраўнік ваеннага ведамства. — Менавіта гэтую адказнасць прынялі на сябе і вы».

Ваенная акадэмія заўсёды адрознівалася якаснай і сур'ёзнай падрыхтоўкай афіцэрскага корпуса краіны. Але нягледзячы на тое, што засваенне ваеннай навукі патрабуе немалых намаганняў, штогод сярод выпускнікоў знаходзяцца медалісты і ўладальнікі чырвоных дыпломаў. І гэты год не стаў выключэннем. Сярод 24 слухачоў факультэта Генеральнага штаба Узброеных Сіл і 81 выпускніка камандна-штабнога факультэта — 12 залатых медалістаў і 22 уладальнікі дыплома з адзнакай.

— Але гэта не азначае, што астатнія выпускнікі падрыхтаваныя горш, — удакладніў **начальнік Ваеннай акадэміі генерал-маёр Сяргей БОБРЫКАЎ.** — Для ўсіх іх падчас навучання ў Ваеннай акадэміі былі створаны аднолькавыя ўмовы. Нашы выпускнікі не адарваныя ад жыцця штабоў, войск. У працэсе навучання шмат увагі мы ўдзяляем практычным заняткам (яны складаюць прыкладна 60% ад навучальнага працэсу. — **Аўт.**), і на крайніх стажыроўках, якія папярэднічаюць выпуску, яны прыкладна арыентуюцца на тыя пасады, якія будуць займаць, і ўжо мэтанакіравана да іх рыхтуюцца.

Адукацыя, атрыманая ў сценах Ваеннай акадэміі Беларусі, карыстаецца папулярнасцю і ў іншых краінах. Як расказаў **начальнік факультэта Генеральнага штаба Узброеных Сіл — намеснік начальніка Ваеннай акадэміі генерал-маёр Андрэй ГУРЦЭВІЧ,** акрамя прадстаўнікоў Узброеных Сіл Беларусі, сёлета з факультэта выпускаюцца прадстаўнікі з Казахстана і Туркменістана. «Для Казахстана гэта ўжо сёмы выпуск, для Туркменістана — трэці, — адзначыў Андрэй Гурцэвіч. — Напрыклад, у нас атрымала адукацыю ўся ваенная эліта Туркменістана: міністр абароны, начальнік Генеральнага штаба, намеснік міністра па тыле, намеснік міністра па ўзбраенні, начальнік нацыянальнай бяспекі Казахстана. Са сцен акадэміі выйшлі камандуючыя акругамі і камандуючы сухапутнымі войскамі Казахстана».

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

— Дыпломы, якія атрымліваюць нашы ваеннаслужачыя ў Ваеннай акадэміі Беларусі, асабліва на факультэце Генеральнага штаба, вельмі высока цэняцца ў Казахстане, — рэзюмаваў **пасол Казахстана ў Беларусі Ергалі БУЛЕГЕНАЎ.** — Выпускнікі, якія за апошнія гады скончылі гэтую вядомую ва ўсім свеце акадэмію, сёння займаюць высокія пасады ва Узброеных Сілах Рэспублікі Казахстан.

**Маёр Аляксей КАВАЛЁЎ,** які скончыў камандна-штабны факультэт з залатым медалём, лічыць, што факультэт з'яўляецца важнейшым этапам у структуры ваеннай адукацыі афіцэра. «Навучанне тут — у першую чаргу, гэта атрыманне значнага, вялікага аб'ёму ведаў, якія неабходныя ў далейшай дзейнасці афіцэра, — упэўнены вайсковец. — Акрамя таго, гэта і перспектыва службовага росту, новы вопыт узаемаадносін у калектыве. Нас, выпускнікоў камандна-штабнога факультэта, перапаўняюць пачуцці гонару за прыналежнасць да афіцэрскага корпуса, адказнасці за лёс дзяржавы, любові да Радзімы і свайго народа».

Афіцэрскія пагоны атрымаюць сёння і курсанты Ваеннай акадэміі, а таксама ўсе тыя, хто вучыўся на ваенных факультэтах грамадзянскіх ВНУ краіны. Урачыстыя мерапрыемствы пройдуць таксама ў Гомелі і Гродне. Усяго ў гэты дзень лейтэнантамі стануць каля 700 чалавек.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

■ Шпацыр па Камароўцы

# НА РЫНКУ БУЙСТВА ВІТАМІНАЎ

## На прылаўках суседнічаюць першыя кавуны і лісічкі

**Чарэшні і клубніцы не губляюць сваёй папулярнасці. Аднак іх паступова выцясняюць персікі і нектарыны, маліны і чарніцы, суніцы ды слівы. Дзе-нідзе чакаюць пакупнікоў першыя кавуны і дыні. Адным словам, ад «жывых вітамінаў» вочы разбягаюцца!**

**Лічыльнік «Звязды»**
*(цана за кілаграм, калі не пазначана іншае)*

**Сала салёнае** — *100-130 тыс.*
**Свініна (кумпяк)** — *85-100 тыс.*
**Свініна (выразка)** — *100 тыс.*
**Ялавічына (кумпяк)** — *130-160 тыс.*
**Фарш (з ялавічыны)** — *60 тыс.*
**Індычка (філе)** — *125 тыс.*
**Кураня бройлернае (бядро)** — *48 тыс.*
**Сардэлькі (з мяса птушкі)** — *42 тыс.*
**Бекон** — *110 тыс.*
**Каўбаса сервелат фінскі** — *120 тыс.*
**Сальцісон** — *100 тыс.*
**Сасіскі з кетчупам** — *38 тыс.*
**Скумбрыя вэнджаная** — *150 тыс.*
**Корушка вяленая** (100 г) — *26 тыс.*
**Яйка курынае** — Д-В (дзясятак) — *16 тыс.*
**Яйка перапялінае** (20 шт.) — *27 тыс.*
**Грэчка** (800 г) — *20 тыс.*
**Гарох** (800 г) — *10 тыс.*
**Фасоля** (800 г) — *27 тыс.*
**Рыс доўгі** (800 г) — *13 тыс.*
**Алей сланечнікавы рафінаваны** (1 л) — *20-26 тыс.*

Але параўнаем цэны. Цяпер сярэдняя цана на чарэшню складае 45 тысяч рублёў. Буйныя ягады аддаюць па 75 тысяч рублёў. Некаторыя прадаўцы прапаноўвалі свой тавар нават за 90 альбо за 100 тысяч рублёў. Радуе, што на прылаўках стала больш айчынных клубніц. Прыдбаць кілаграм смакоцця можна за 35-50 тысяч рублёў. Малдаўскія ды іспанскія абрыкосы прапануюць адпаведна па 40 і 50 тысяч рублёў за кілаграм. За такую ж суму можна набыць кіло персікаў альбо нектарынаў. З Іспаніі прыехалі буйныя прыгожыя іспанскія слівы — іх прадаюць за 50 альбо 55 тысяч рублёў за кілаграм. (Дарэчы, столькі ж каштуе адзін плод авакада, а вось адно манга аддаюць за 85 тысяч рублёў.)

За кілаграм асіповіцкіх малін просяць не менш як 120 тысяч рублёў, а з Беразіно — 100 тысяч рублёў.

Паўлітровы слоік духмянай ягады выходзіць у сярэднім за 50 тысяч рублёў. Кілаграм суніц аддаюць па 70-80 тысяч рублёў, сярэдні кошт на чарніцы складае 35 тысяч рублёў.

Першыя кавуны сустракаюцца па розных цэнах: у адным месцы — 6 тысяч рублёў за кілаграм, у іншым — 16 тысяч за кілаграм. Невялікія дыні «калгасніца» ідуць па 45-50 тысяч за кілаграм.

Памідоры ёсць па розных коштах, але беларускія выходзяць бюджэтнымі: за кілаграм «Малышка» просяць 27 тысяч рублёў. Для параўнання — вялізныя ружовыя з Украіны каштуюць на дзесяць тысяч даражэй. Але самыя «залатыя» таматы сорту «Бычынае сэрца»: іх аддаюць не менш як за 65 тысяч рублёў.

Агуркі лёгка знайсці па 7, 8, 9 тысяч рублёў за кілаграм, хоць сустракаюцца і па 12-13 тысяч. Маладую капусту аддаюць па 10 тысяч рублёў, раннія буракі — па 15-16 тысяч рублёў за кілаграм. Коштавы дыяпазон на маладую бульбу пачынаецца з 6 тысяч рублёў і даходзіць да 18 тысяч рублёў за кілаграм. Вялікі пучок радыскі прапануюць па 35 тысяч рублёў — гэта эквівалент трох галоўкам часнаку, альбо «букету» са стаграмовых пукоў зялёнай цыбулі, кропу, пятрушкі, ліставой салаты і рукалы.

На прылаўках знайшліся і лісічкі — па 150 тысяч рублёў за кілаграм. Для параўнання — кіло шампіньёнаў каштуе ў сярэднім 45 тысяч рублёў.

Завяршаючы шпацыр па «Камароўцы», з асалодай спаталяю смагу квасам — паўлітра халоднага напою каштуе 10 тысяч рублёў.

**Кацярына РАДЗЮК**

■ Соцыум

# ХЛОПЧЫК ВЫРАС, ДЫ ЛЁС НЕ ПЕРАМЕНІШ

## Нататкі пасля камандзіроўкі па пісьму

**Гэта пісьмо можна было адразу пакласці ў архіў, бо яно не змяшчае прозвішча аўтара і тым самым трапляе ў разрад ананімак. Але ліст нагадваў крык душы аб дапамозе хлопчыку, тым больш інваліду. Суседзі, так падпісаны зварот у рэдакцыю, расказваюць, што хлопчык Саша Хлебнік, які жыве па вуліцы Леніна ў Пружанах, рана застаўся без маці, цяпер ён не дагледжаны, забыты, пакінуты, часам, магчыма, галадае. А бацька даўно жыве ў Мінску з новай сям'ёй, пра сына забыўся, пакінуўшы дзіця пад апекай сваёй сястры, значыць, Сашынай цёткі.**

Першае, што падумалася пасля прачытання, што быць такога не можа. Спецыялісты з аддзелаў адукацыі адсочваюць дзяцей-сірот і аператыўна прымаюць меры па іх абароне. У аддзеле адукацыі райвыканкама сказалі, што непаўналетняга інваліда з такім прозвішчам у іх горадзе няма. Пазней высветлілася, што Аляксандр Хлебнік, інвалід другой групы, пражывае ў Пружанах па вуліцы Леніна. Яму 31 год.

А для старых суседзяў, на чыіх вачах ён вырас, Саша па-ранейшаму застаецца хлопчыкам. І гэта можна зразумець, як і іх абурэнне бацькам Аляксандра, які мала ўвагі ўдзяляе хвораму сыну. Але не ўсё так проста.

**З псіхолагам раённага тэрытарыяльнага цэнтра абслугоўвання насельніцтва Ганнай МЫШКЕВІЧ** наведваем Галіну Несцярчук, з якой і пражывае разам Аляксандр Хлебнік. У доме хоць і бедна, але даволі чыста і акуратна. Галіна Міхайлаўна запрашае прысесці на кухні, дзе мы з ёй і гутарым.

54-гадовая Галіна Несцярчук не працуе праз інваліднасць, у яе праблемы з пазваночнікам. Раней яна доўгі час працавала медсястрой. Калі гаворка заходзіць пра Сашынага бацьку, гаспадыня дома вельмі нервуецца, расказвае эмацыянальна, часам амаль зрываючыся на крык скрозь слёзы. Але паступова яна супакойваецца, і вымалёўваецца няпростая гісторыя жыцця маладога інваліда.

Нарадзіўся Саша глухім, ёсць і іншыя праблемы са здароўем. Маці хлопчыка хварэла на рассеяны склероз і памерла, калі дзіцяці было ўсяго пяць гадоў. Гадавалі яго бабуля і цётка Галіна. Бацька неўзабаве стварыў новую сям'ю і ўжо шмат гадоў жыве ў Мінску.

Сашу на некаторы час адпраўлялі ў спецыялізаваныя ўстановы, дзе ён вучыўся ў асяродку равеснікаў. Малады чалавек не гаворыць, але ўсё разумее, бо добра ўмее чытаць па губах.

— Ён быў асабліва прывязаны сэрцам да бабулі, — расказвае Галіна. Яна ў канцы жыцця зусім аслепла. Саша быў для яе вачамі, а яна для яго вушамі, так яны падтрымлівалі адно аднаго.

Дзесяць гадоў таму бабуля памерла, указаўшы ў завяшчанні, што права на дом пераходзіць да дачкі Галіны. Праўда, гэта было зроблена са згоды сына Генадзя, ён не прэтэндаваў на сваю частку спадчыны, аддаючы належнае сястры за яе гатоўнасць даглядаць пляменніка.

Нельга сказаць, што цяпер ён зусім не падтрымлівае сына. Паводле слоў Галіны, брат штомесяц прысылае па 500 тысяч рублёў; калі яна папросіць, то перавядзе крыху больш, напрыклад 700 тысяч. «Але ж гэта вельмі мала, — абураецца жанчына. — Сашына пенсія складае 1 700 000 рублёў, мая — 2 500 000. Трэба ж хлопца накарміць, апрануць, купіць лекі. У яго праблемы з падстраўнікавай залозай, перыядычна праводзяцца курсы лячэння. А ў хаце даўно неабходны рамонт».

Яна лічыць, што брат мог бы дапамагаць больш адчувальна. І прычынай такой скупаватасці Галіна называе новую жонку брата. Суседзі ёй нават раілі падаць у суд і спагнаць аліменты з Генадзя на ўтрыманне сына. Толькі яна палічыла ў дачыненні да брата такі крок непрымальным, нават высвятляць не стала, ці сапраўды магчыма так вырашыць пытанне.

— Саша — мой сын, я яго выгадавала змалку, і нават калі будзе толькі мая і яго пенсія, неяк пражывём. У цягніку некалі сустрэлася з жанчынай. Тая прапанавала паваражыць на картах і сказала: «У цябе будзе сын, але не твой, да таго ж інвалід». Тады мне было 23 гады, жыццё наперадзе, яно здавалася шчаслівым, неабсяжна-бясконцым, нават увагі асаблівай не звярнула на такое прароцтва. А потым усё стала збывацца. Відаць, такі лёс. Такі мой крыж, і мне яго несці, — хавае за штучнай усмешкай слёзы жанчына.

Галіна Міхайлаўна расказвае, што у іх ёсць свой агарод, на якім Саша ёй першы памочнік. Ён з задавальненнем гатуе на кухні розныя стравы, але трэба крыху пакамандаваць, адным словам, многае можа зрабіць пад наглядам. І псіхолаг Ганна Мышкевіч успомніла, калі яна наведвала гэту сям'ю папярэдні раз, Аляксандр смажыў бліны на кухні. Яшчэ ў Галіны ёсць невялікі дамок у вёсцы, куды яны таксама час ад часу наведваюцца разам. І там Саша дапамагае падтрымліваць парадак.

Яшчэ раз уважліва чытаем ліст з **дырэктарам тэрытарыяльнага цэнтра Нэлі ПЕДЧАНКА.** Нэлі Георгіеўна кажа, што па іх мерках гэта звычайная сям'я інвалідаў. Звяртаю яе ўвагу на радок, дзе суседзі згадваюць любоў да выпіўкі як Галіны, так і яе сужыцеля. «Можа, дыму без агню не бывае. Але ж не злоўжываюць яны так, каб п'янымі валяліся, — заўважае дырэктар цэнтра. — Кожную нядзелю Галіна з пляменнікам ходзяць у царкву на службу. Вось толькі наш цэнтр для дзённага знаходжання інвалідаў Аляксандр Хлебнік не наведвае. Яго запрашалі, ён і цётка яго не адмаўляюцца, але і прыходзіць малады чалавек не спяшаецца. А ў нас дзейнічае вельмі добрая праграма па рэабілітацыі маладых інвалідаў. Яны займаюцца ў розных гуртках, вучацца».

* * *

Пра гэту сям'ю не скажаш, што тут жыве шчасце. Лёс, як у многіх людзей з паталогіямі, так і тых, хто побач з імі, незайздросны. Невялікія даходы, пастаянная няхватка грошай, адсутнасць якіх-небудзь перспектыў накладваюць свой адбітак. Але ж людзі прызвычаіліся жыць, падтрымліваць адно аднаго, іншага ім не дадзена. Відаць, і суседзі складалі свой ліст у рэдакцыю не з горшымі думкамі альбо намерамі. Толькі вось прымусіць бацьку, які дасягнуў пенсійнага ўзросту, больш дапамагаць сыну-інваліду наўрад ці ў каго атрымаецца. Гэта пытанні сумлення і асабістага выбару кожнага.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

*г. Пружаны*

# Медыкі, эколагі, цырульнікі

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Зніжаць напружанасць у грамадстве будуць медыятары сацыяльных канфліктаў і спецыялісты па адаптацыі мігрантаў. Кансультант па бяспецы асабістага профілю будзе праглядваць інфармацыю ў сеціве пра кліента і, калі неабходна, падчышчаць яго анлайн-вобраз. Вырасце попыт на трэндвотчараў (тых, хто адсочвае новыя тэндэнцыі) і распрацоўшчыкаў персанальных пенсійных планаў.

Гэты аналіз рабілі з улікам сітуацыі на расійскім рынку працы, але, на думку **старшага даследчыка CASE Belarus (Цэнтр сацыяльных і эканамічных даследаванняў) Уладзіміра ВАЛЕТКІ,** прагнозы цалкам верагодны і для беларускіх рэалій.

Эксперт раіць таксама звяртаць увагу на новыя напрамкі, якія адкрываюцца ў ВНУ. Гэта непасрэдны водгук на попыт з боку рынку працы.

— Прынамсі ў БДЭУ летась пачалася падрыхтоўка эканамістаў-аналітыкаў у межах спецыяльнасці «Нацыянальная эканоміка». Выпускнікі змогуць ацэньваць не толькі стан эканомікі рэгіёнаў, фінансавага рынку, але і эфектыўнасць дзяржаўных і карпаратыўных праграм і палітык. У спецыялізаванай эканаметрычнай лабараторыі на базе прыкладнога пакета аналізу Stata студэнты будуць авалодваць сучаснымі колькаснымі і якаснымі метадамі аналізу, такімі як фокус-групы, экспертныя апытанні, — прыводзіць прыклад Уладзімір Валетка.

Сярод цікавых сёлетніх навінак — 3D-мадэляванне (працаваць з трохмернымі тэхналогіямі будуць вучыць у БДТУ), біяінфарматыка (спецыяльнасць прапануе БДУ), тэхнічная праца і тэхнічная творчасць (Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт).

Апроч гэтага, будзе расці попыт на высакакласных спецыялістаў па найме персаналу. «Бо канкурэнтаздольнасць эканомікі вызначаецца як якасцю чалавечага капіталу, так і адпаведнасцю людзей месцу працы», — заўважае даследчык.

### Бібліятэкары і турагенты знікнуць?

Хто на рынку ў будучым акажацца лішнім? Апошнія гады паступова зніжалася патрэба ў рабочай сіле. Калі ў 2011-м у агульнай структуры вакансій доля такіх месцаў складала амаль 78 працэнтаў, то цяпер — менш за палову.

Скарачаецца попыт на кадры ў банкаўскай сферы. «Мы гэта бачым на працягу апошніх трох гадоў, — каментуе Алег Токун. — Гэта галіна, дзе многае можа быць аўтаматызавана. Ужо сёння некаторыя банкі адмаўляюцца прымаць плацяжы ад насельніцтва, ставяць тэрміналы».

— Будзе змяншацца патрэба ў тэхнічных работніках, кшталту падлікоўцаў, — дадае Уладзімір Валетка. — Неабходнасць у персанале, які займаецца ўводам даных, таксама адпадзе, паколькі сучасныя айці-тэхналогіі дазваляюць лёгка запісаць інфармацыю ў электронным выглядзе, абмінаючы папяровы варыянт.

У даведніку, распрацаваным «Сколкава», сярод спецыяльнасцяў-«пенсіянераў» — бібліятэкары, паштальёны, турагенты, капірайтары. Расійскія даследчыкі ўпэўнены, што да 2020 года гэтыя прафесіі знікнуць. Беларускія эксперты не такія катэгарычныя. «Магчыма, калісьці так і будзе, але не ў бліжэйшыя 10 гадоў», — выказаўся Алег Токун.

Прагнозы не заўсёды цалкам спраўджваюцца, адзначае прадстаўнік міністэрства.

— Некалі думалі, што нам не патрэбна будзе столькі бухгалтараў, колькі ёсць. Планавалася, што ўкараніцца праграмнае забеспячэнне і замест пяці работнікаў будзе адзін, які з усім справіцца. Існавалі нават праекты па перанавучанні бухгалтараў у праграмісты. Але гэтага чамусьці не адбылося. Не ўгадалі і з псіхолагамі. Гадоў 15 таму казалі, што яны будуць вельмі папулярныя. Жыццё паказала, што не настолькі. Псіхолагі ў нас занялі пэўную нішу ў школах і дзіцячых садах.

Эксперты раяць прыглядзецца да новых спецыяльнасцяў у ВНУ.

### Адгадаць на 100 працэнтаў немагчыма

**Аукцион состоится 26 июля 2016 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
- *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
- *индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;
- *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

- представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
- физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;
- представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 20 июля 2016 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/**

Утерянные представительством Белгосстраха по Октябрьскому району г. Минска бланки страховых полисов по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории государств-членов системы «Зеленая карта» серии BY01 №№ 10104451, 10104452 **считать недействительными».**

УНП 100122726

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 24 (324)

■ Акцыі

## РАЗВІТАННЕ З ТЫСЯЧАЙ

**Незвычайная акцыя пройдзе заўтра, 26 чэрвеня, у Нацыянальным мастацкім музеі**

Дэнамінацыя беларускага рубля — справа не толькі эканамічная. Цягам 17 гадоў выява будынка Нацыянальнага мастацкага музея ўпрыгожвала купюру старога ўзору наміналам у тысячу рублёў. Таму супрацоўнікі ўстановы вырашылі зладзіць сімвалічнае развітанне — акцыю «Тысяча, бывай!».

Цягам усяго дня кошт уваходнага білета на экспазіцыю мастацкага музея складзе... усяго 1 000 рублёў. Так, пабачыць шэдэўры з фондаў музея і ўсе часовыя выстаўкі ў гэты дзень можна будзе амаль бясплатна. Таксама адбудзецца ўрачыстая цырымонія падпісання купюры наміналам у 1 000 рублёў генеральным дырэктарам музея Уладзімірам Пракапцовым і перадача гэтага ўжо амаль гістарычнага прадмета ў музейны архіў.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

# ПА СЛЯДАХ ВАВІЛОНСКАЙ ВЕЖЫ,

Фота www.agt.by

# або СКУЛЬПТУРЫ НАСТУПАЮЦЬ

**Адна з самых маштабных вулічных інсталяцый лета, якая знаёміла нас мінулы раз з жалезным хакеістам і вялізнай вежай з біблейскага падання, зноў адкрылася на тэрыторыі Камсамольскага вострава ў парку Перамогі — знакамітыя «Арт-астравы». Гэта не проста вернісаж пад адкрытым небам, а цэлы мастацкі маршрут. За кожным паваротам сцяжынкі — новы сімвалічны аб'ект, вельмі філасофскі, часта пададзены з іроніяй альбо гумарам, але заўсёды поўны эмоцый. Ад дызайнерскіх задумак да трэш-арту. Мастацкія работы сталі часткай гарадскога асяроддзя, збіваючы яго афіцыяльнасць і штодзённасць, дадаючы крэатыўнасці. Гэта ўжо адна з устойлівых тэндэнцый сучаснага беларускага мастацтва. Магчыма, вы будзеце шакаваныя. Але дакладна здзівіцеся. Запомніце: гэта public art, а не акадэмічная манументальная скульптура.**

Намеснік старшыні Саюза беларускіх мастакоў Леанід Хобатаў адзначыў на адкрыцці праекта, што пляцоўка арт-астравоў – гэта не толькі эстэтыка, тут пастаўлены сур'ёзныя пытанні прасторы, пластыкі, стылістыкі і інтэлектуальнай думкі. У творчым «сусвеце» зразумела.

Пятнаццаць аб'ектаў у некалькі метраў з самых розных матэрыялаў – металу, дрэва, пластыку. Свабода ў формах і колерах, поўны эксперымент, нацыянальны авангард. На востраве прадстаўлены самыя незвычайныя з'явы (а можа і звычайныя, але ў арыгінальнай акантоўцы). Чырвоны партал з камянямі, які вядзе на парог вечнасці, белыя коканы на дрэвах, нібыта з логава гіганцкага павука, драўляны веласіпед з трыма коламі, які нагадвае гаўбіцу, каляровыя цені, што танцуюць, дрэва-лега, якое прырасло да ствала сасны, квэст з дарожных знакаў...

Дырэктар Нацыянальнага цэнтра сучаснага мастацтва Наталля Шаранговіч прызналася, што ўсіх мастакоў наўмысна выбіралі па прынцыпе «яны павінны быць вельмі рознымі». Сярод скульптараў і дызайнераў, творамі якіх можна палюбавацца – Дзмітрый Сурскі, Канстанцін Селіханаў і Павел Вайніцкі, Алена Атрашкевіч-Златковіч, Віктар Копач і Максім Пятруль. Прадставілі свае творчыя выказванні Канстанцін Мужаў, Сяргей Аганаў, Вольга Нячай, а таксама Ігар Лявонцьеў і Таццяна Гомза. Не засталіся ў баку Віктар Старухін, Аляксей Сарокін, Аляксандр Сакалоў, Васіль Цімашоў, Паліна Пірагова.

Адзін з удзельнікаў, скульптар Іван Арцімовіч параўнаў мінскія «Арт-астравы» са швейцарскім опэн-эйрам, адным з самых буйных у Еўропе, дзе скульптура таксама надзвычай удала інтэгравалася ў архітэктурнае і прыроднае асяроддзе. «Спадзяюся, Мінск усё ж атрымае свой маштабны парк скульптур, якімі будзе дзейнічаць на пастаяннай аснове, а «Арт-астравы» пашыраць свой фармат да міжнароднага». У праекце сёлета бярэ ўдзел польскі мастак Рэмігіуш Дулька, што прадставіў скульптуру «Горад».

Праект «Арт-астравы» з'яўляецца выдатным прыкладам таго, як паркавая зона ператвараецца не проста ў месца адпачынку, а ў культурную пляцоўку. Аб'екты так ці інакш прымушаюць спыніцца.

Арганізатар выставы – Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў. Праходзіць яна пры падтрымцы Міністэрства культуры Беларусі і Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта. Спонсарам выступіў «Альфа-Банк» (Беларусь). Між іншым, Альфа-прышчэпка ад банка, выстаўленая мінулы раз, ужо стала вай-фай лаўкай побач з Нацыянальным цэнтрам сучасных мастацтваў на вуліцы Някрасава, 3. Такі ж лёс угатаваны новаму аб'екту ад спонсараў – чырвонаму ветразю. Тры месяцы наведванняў даступныя ў любы час дня і ночы – гэта абавязкова трэба ўбачыць.

**Марыя ВОЙЦІК.**

■ Далягляды

Майкл МАРГУЛІС:

# «БЕЛАРУСЬ — КРАІНА СХАВАНЫХ ТАЛЕНТАЎ»

## Як аўтару праз прызму жыцця краіны адлюстраваць увесь свет?

**З Ганаровым консулам Беларусі ў штаце Флорыда (ЗША) спадаром Майклам МАРГУЛІСАМ можна весці бясконцыя гутаркі на розныя тэмы. Ён знакаміты багаслоў, палітолаг, аўтар канцэпцыі духоўнай дыпламатыі, а таксама пісьменнік, рэдактар амерыканскага часопіса US-Belarus, які расказвае жыхарам Злучаных Штатаў пра нашу краіну. Не так даўно спадар Майкл завітаў у Беларусь, каб прыняць удзел у V Усебеларускім народным сходзе, а наш карэспандэнт звярнулася да яго з пытаннямі пра ролю літаратуры ў сучасным свеце, місію айчынных пісьменнікаў, ну і натуральна, — пра ўспрыманне жыхарамі ЗША часопіса пра Беларусь.**

**— Спадар Майкл, ці ёсць будучыня ў літаратуры?**

— Сёння літаратура не адыгрывае ў жыцці людзей такой ролі, як раней. Але ўсё роўна яна не памерла і суправаджае чалавека. Ды яна і не можа памерці, думаю, што чалавецтва раней ці пазней вернецца да чытання. Лепшы доказ таму: калі зайсці ў кнігарню, можна пабачыць шмат сучасных выданняў класікі, новых раманаў. Але ж гэта таксама бізнес: калі кнігі выдаюцца — значыць імі нехта цікавіцца. Таксама лічу, што папяровая кніга, дзякуючы прыемным атрыбутам яе чытання — паху друкарскай фарбы, працэсу перагортвання старонак, — пераможа электронную.

**— Што павінна несці свету літаратура?**

— Памяць пра мінуўшчыну. Як казаў Горкі: хто плюе ў сваё мінулае, той страляе ў сваю будучыню. Кожны пісьменнік у сваіх кнігах паказвае краіну, але добры аўтар праз яе прызму адлюстроўвае ўвесь свет, ён піша пра вечныя паняцці любові, спачування, болю, смеху скрозь слёзы.

**— Усё часцей кажуць пра вяртанне аўтараў да жанру вялікага рамана, аднаўленне цікавасці чытачоў да яго...**

— Тут назіраюцца два паралельныя працэсы. Час інтэрнэту прымушае людзей чытаць тэксты вельмі кароткай формы. Вы ж не будзеце ў сацыяльных сетках размяшчаць і чытаць некалькі старонак. Але калі ў чалавека знікае магчымасць засяродзіцца, задумацца, пасупераживаць чужому болю і чужому каханню (а менавіта гэтыя адчуванні дае вялікі раман), то ён знікае як асоба. Таму і адбываецца вяртанне да вялікіх жанраў прозы. Раптам зноў пачалі чытаць «Вайну і мір» Талстога, прозу Дастаеўскага. Кніга — гэта не толькі працэс чытання, гэта сыход у чыёсьці жыццё, дзе вы знаходзіце водгулле ўласнага лёсу, свайго кахання і болю. Добрая літаратура валодае такімі ўласцівасцямі. Кароткая форма твора не дазваляе чытачу перанесціся ў іншае жыццё, а раман — дае такую магчымасць. У кнізе і ў каханні трэба заставацца сам-насам.

**— Каго лічыце сваімі літаратурнымі настаўнікамі?**

— Гэта ў асноўным амерыканскія пісьменнікі, я на іх выхоўваўся. Эрнест Хемінгуэй, Фрэнсіс Скот Фіцджэральд, з нямецкіх — Эрых Марыя Рэмарк. Гэтая літаратура ў час маёй маладосці была навіной. Сёння яна ўжо ператварылася ў класіку.

**«Тут людзі вельмі сціплыя і часта пра сябе не кажуць. Значыць — нехта іншы пра іх павінен сказаць».**

**— Ці сочыце за падзеямі ў беларускай літаратуры, чытаеце кнігі нашых аўтараў?**

— Так, канешне, чытаю Васіля Быкава, чытаю кнігі аўтара з Брэста Аляксандра Валковіча, іншых сучасных пісьменнікаў. Нобелеўская лаўрэатка Святлана Алексіевіч напісала важныя, патрэбныя творы, але жорсткія, праўдзівыя, магчыма, надта страшныя. Праўда заўсёды надта страшная. Я не лічу, што яе кнігі маюць высокі літаратурны ўзровень, але яна — важны публіцыст. Мала стала літаратуры на ўзроўні, на якім я хачу яе бачыць. У мяне ўласныя крытэрыі: параўноўваю новыя кнігі з тымі, што для мяне лічацца вельмі высакаякаснымі. Я разумею, што адбываецца ў беларускай літаратуры і лічу, што ў бліжэйшы час павінна з'явіцца некалькі яркіх асоб новага пакалення, якія напішуць выдатныя кнігі. Думаю, што Беларусь — краіна схаваных талентаў. Тут людзі вельмі сціплыя і часта пра сябе не кажуць. Значыць — нехта іншы пра іх павінен сказаць. Магчыма, гэта мушу рабіць я, пакуль жывы.

**— Вы маеце шмат сяброў сярод беларусаў, не толькі пісьменнікаў, але і кампазітараў, палітыкаў. Напэўна, многія стасункі — ужо самі па сабе гісторыі, нават легенды?**

— Так, напрыклад, з кампазітарам Ігарам Лучанком мы сябруем з 17 гадоў. Яшчэ калі ён быў студэнтам кансерваторыі, а я вучыўся ва ўніверсітэце. У Гомельскай філармоніі мы зарабілі разам першыя грошы на сумеснай песні: я напісаў словы, а ён — музыку. Ужо праз многа гадоў, калі я прыехаў з дэлегацыяй Кангрэса ЗША, Лучанок мяне спачатку не пазнаў, але калі я заспяваў радок з той самай песні: «Зеркалом волшебным серебрится Сож...», ён адразу падбег да раяля і пачаў іграць, сказаў: «Майкл, гэта ты!»



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Дарэчы**

Падчас візіту спадара Майкла Маргуліса ў Беларусь адбылася сустрэча Ганаровага консула Беларусі ў штаце Флорыда з пісьменнікам, рэдактарам і ўкладальнікам Брэсцкага раённага краязнаўчага альманаха «Астрамечаўскі рукапіс» Аляксандрам Валковічам. Аляксандр Міхайлавіч перадаў у калекцыю Майкла Маргуліса беларускі вышываны ручнік, а таксама прэзентаваў новы выпуск «Астрамечаўскага рукапісу». Дарэчы, матэрыял пра гэты ўнікальны альманах плануецца да выхаду ў наступным нумары часопіса US-Belarus.

Не абышлося без сюрпрызаў: Аляксандр Валковіч атрымаў прэмію амерыканскага тоўстага літаратурнага часопіса The New Review па выніках літаратурнага конкурсу фонду «Духоўная дыпламатыя» за кнігі «Бяроза чорная, бяроза белая» і «Лета чырвоных коней».

**«У найбліжэйшы час павінна з'явіцца некалькі яркіх асоб новага пакалення, якія напішуць выдатныя кнігі».**

**— Часопіс US-Belarus выдаецца ў шыкоўным на сёння фармаце: глянцавая папера, шмат ілюстрацый. Ці складана трымаць такі ўзровень у час панавання электронных СМІ?**

— Тое, што карысна для чалавека, — складана. А калі шкодна, — проста. Некалі казалі, што інтэрнэт заменіць газеты, бо навошта доўга перагортваць старонкі, калі можна хутка знайсці патрэбныя навіны ў інтэрнэце. Але гэта не працуе! Сёння інтэрнэт займае ў некалькі разоў больш часу, чым газеты. Таму людзі вернуцца да друкаванага слова. Вось і я стаў выдаваць часопіс, таму што ў інтэрнэце ніхто пра Беларусь інфармацыю не знойдзе. Там яна, натуральна ёсць, але яе ніхто не будзе шукаць і чытаць. Мне ж патрэбна адкрыць краіну як з'яву, каб пра яе даведаліся многія. Тыраж нашага выдання — 5 000 асобнікаў, яго атрымліваюць у Кангрэсе, сенаце, у буйных банках, універсітэтах, бібліятэках. Наш мэтавы чытач — эліта амерыканскай нацыі, бо менавіта яна прапагандуе ідэі ў масах. Мы расказваем амерыканцам пра беларускі гумар, традыцыі, ручнікі, пра Хатынь і Брэсцкую крэпасць... Самі жыхары Беларусі пра гэта выдатна ведаюць, але для чытача ў Штатах — гэта як звесткі з іншай планеты.

**— Выйшла ўжо тры выпускі часопіса. Ёсць нейкія водгукі чытачоў?**

— Водгукі вельмі добрыя. Хоць я рыхтаваўся да негатыўнай рэакцыі. Часопіс усім падабаецца: палітыкам, бізнесменам, банкірам і простым чытачам. Ды і самім беларусам, якія чытаюць па-англійску, часопіс таксама прыйшоўся даспадобы: яны самі бачаць сваю краіну па-новаму, нібыта збоку.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

■ Прэм'ера

# БЕЗ ПРАВІЛАЎ

## Як не зрабіць гульню ў тэатры гульнёй у тэатр?

**Прыходзіш у тэатр, сядаеш. Выходзяць акцёры — і запрашаюць на квэст. Гэта значыць, прапануюць гульню, у якую б уключыўся кожны з прысутных. Квэсты — гульні інтэрактыўныя. Ключавое тут «актыўныя». Адседзецца не атрымаецца, прыйдзецца ўключацца, выконваць, па магчымасці, сваю ролю ў гульні, сюжэт якой ужо кімсьці спланаваны. У гэтым выпадку — аўтарамі спектаклю «Гульня без правілаў і з невядомай мэтай», што з'явіўся ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі.**

Аўтар тэксту — Аляксей Андрэеў, галоўны рэдактар альманаха «Маналог». «Маналогу» споўнілася 20 гадоў, і гэтую дату яго стваральнікі вырашылі адзначыць яшчэ і пастаноўкай у тэатры. Пастаноўкай, у якой ёсць шмат маналогаў. Слова драматургія (як асаблівы від творчасці) у дачыненні да таго, што прамаўляецца, тут не выкарыстаеш: асаблівасць спектаклю менавіта ў тым, што ён не ствараўся паводле п'есы, а паўставаў як тэкст, складзены з цытат вядомых асоб, з думкамі якіх знаёміў часопіс. Думкі цікавыя, як і людзі, якія былі іх аўтарамі, напрыклад, Святлана Бень, Алена Казанцава, Адам Глобус, Віктар Капыцько, Сяргей Харэўскі, Руслан Вашкевіч і іншыя. Усе словы гучаць па-беларуску дзякуючы перакладу пісьменніка Альгерда Бахарэвіча. Наўрад ці ён бы ўзяўся перакладаць тое, у чым не бачыць сэнсу.

Аляксей Андрэеў з асобных цытат склаў цэльны тэкст, які прамаўляюць два акцёры: Людміла Сідаркевіч і Максім Брагінец. У іх складаная задача паводле рэжысёрскай задумы Аляксандра Марчанкі. Вельмі разумнымі фразамі яны павінны гледача ўцягнуць у слуханне і развагі, нават не столькі ў дзею — яе наогул няма, як няма выразнага сюжэту з яго развіццём, кульмінацыяй, развязкай. Пры тым, што запрашэнне на квэст — і разам з гэтым інтрыгу — мы атрымліваем. Значыць, штосьці павінны знайсці ў выніку, да чагосьці прыйсці. Да чаго?

Ён і Яна суіснуюць у прасторы. Нельга сказаць, што яны ўзаемадзейнічаюць. Гэта ўсё не пра адносіны дваіх. Ён і Яна — таму што гучаць цытаты жаночыя і мужчынскія. Не толькі ад імя жанчыны ці мужчыны, проста адны больш эмацыянальныя. Частка ад імя мужчыны крыху іншая: яна бярэ разважлівасцю. Але і Яна і Ён разам увасабляюць супольнасць людзей, якія разважаюць пра НЕШТА. І да гэтага «нечага» мы павінны прыйсці ў выніку інтэлектуальнага квэсту. Мы яго шукаем, пра яго разважаем разам з артыстамі. Наш інтэрактыў у тым, як мы адгукаемся на думкі. Таму гульня ідзе сапраўды не паводле звыклых для квэстаў правілаў. Але тое не азначае, што іх няма, асабліва, калі зададзеныя параметры. Спачатку думаеш, што героі гавораць адзін з адным. Не. Потым адчуванне, што яны нібыта спавядаюцца — з-за шчырасці і балючай прадуманасці фраз. Але наўрад ці: споведзі не прамаўляюцца голасна. Ці можа на гэтым сышла плынь свядомасці, калі вельмі хочацца сказаць пра штосьці, і нават не важна, хто цябе ў гэты момант пачуе? Калі хоць хто — ужо добра. Ну, бывае ж так у жыцці. Словы, сказаныя з тэатральнай сцэны, ніяк не могуць быць выпадковымі, калі яны прамоўленыя, то таму, што так трэба. З намі гуляюць у прасторы, дзе не адбываецца нічога больш важнага, чым словы.

Гэта гульня на выжыванне гледача, які праходзіць выпрабаванне словамі. Колькі часу ідзе на тое, каб уцягнуцца і зразумець: не варта чакаць дзеі. Нельга лічыць дзеяй тое, што артысты перамяшчаюцца (не вельмі актыўна) па сцэне, рэагуюць на стосы кніг, складзеныя перад імі, сядаюць на стосы, кладуцца на іх. Выцягваюць з іх кнігі і пачынаюць чытаць. І ніякіх дадатковых эфектаў! Акрамя хіба што голасу. Спачатку ён гучыць за сцэнай — не бачым выканаўцу. Па меры напружання думак у цытатах, спявак Дзмітрый Лук'янчык з'яўляецца на нашых вачах. Павольна-распеўна гучыць яго голас. Удумліва — якраз пад словы. Гэты голас дапамагае злучаць думкі, якія першапачаткова існавалі асобнымі выказваннямі, утварае з іх агульны сэнс. Напрыклад, словы пра гарадскі асяродак Мінска, сталіцы, а голас у той час звяртае да фальклорнай манеры, дадаючы штосьці роднае, цёплае, нібыта з паралельнага Сусвету. І менавіта гэты голас злучае прасторы, якія, здаецца, зусім не перасякаюцца. Нібыта як Яна і Ён — розныя, часам здаюцца чужымі людзьмі. А калі ўслухаешся ў іх словы на фоне гэтага спеву, то разумееш: яны ўсё ж звязаныя агульнай культурнай прасторай. Менавіта яна і ёсць галоўная дзеючая асоба гэтай пастаноўкі. Гэта культурная прастора — нацыянальная, дзе ёсць месца розным людзям, розным меркаванням і развагам пра тое, што мы ёсць цяпер як народ: як мы адчуваем, што памятаем, што любім, пра што марым, дзе жывём і па якіх правілах.

І калі напрыканцы доўгіх разважанняў разам з акцёрамі ты прыйшоў да разумення гэтага, то лічы, свой квэст прайшоў паспяхова. Хоць задача і не простая: прадзірацца скрозь шчыльную канцэнтрацыю думак на адну хвіліну спектакля. Гэта квэст для інтэлектуалаў, для якіх уся інтрыга — не ў фабуле, а ў саміх думках. І калі вы яшчэ вагаецеся, ці прылічваць сябе да гэтай слаўнай катэгорыі грамадзян, то лепшы сродак праверыць — пайсці і пагуляць. Дасядзеў да фіналу — усё, пытанне знятае.

**Ларыса ЦІМОШЫК,** *tsimoshyk@zviazda.by*



■ Невядомае пра вядомых

# АСТРАВЫ ШЧАСЦЯ АЛЯКСАНДРА ЛЯГЧЫЛАВА

## Пра жыццё і творчасць знанага паэта-песенніка расказалі яго бацькі

**Яго няма ўжо больш за дзесяць гадоў, а песні, якія ён напісаў, жывуць і сёння. І не проста жывуць, а гучаць з вуснаў вядомых артыстаў і гуртоў. У апошні дзень чэрвеня аўтару слоў «Горычягады» і «Чаркі на пасашок», а таксама яшчэ каля чатырохсот песень, споўнілася б 70...**

Менавіта столькі ж — толькі юбілей сумеснага жыцця — адзначалі бацькі Аляксандра Лягчылава, калі я завітала да іх у госці. Яны не святкавалі. Пасля таго, як не стала іх любімага Сашачкі, свята ў кватэры Лягчылавых бывае рэдка. Ды і ўзрост ужо не той. У верасні Вользе Паўлаўне споўніцца 95 гадоў, Кузьма Васілевіч на год маладзейшы за жонку. Іх лёсы таксама вартыя цэлай аповесці, але гэтым разам ветэраны Вялікай Айчыннай вайны расказваюць пра сына.

Разам з бацькамі. 2003 год.

### Дзядзька — беларускі Марэсьеў

Аляксандр быў першынцам. Як жартуе Вольга Паўлаўна, яна тройчы сумленна выконвала пяцігодку — нараджала сыноў раз на пяць гадоў. Хлопчыкаў назвалі імёнамі ўсіх палеглых на фронце братоў Кузьмы Лягчылава: Аляксандрам, Уладзімірам і Сяргеем.

Дарэчы, да вайны Вольга Паўлаўна працавала ў аддзеле пісьмаў «Звязды». У галоўную партыйную газету яе прывёў брат. Аляксандр Русановіч, імя якога носіць вуліца ў Мінску, працаваў у «Звяздзе» і тэхнічным сакратаром, і літаратурным супрацоўнікам аддзела культуры. У гады вайны служыў на ваенна-марскім флоце. Падчас размініравання водаў Волгі ён быў моцна паранены — ампутацыя нагі была непазбежнай. З 36 чалавек засталіся жывымі толькі двое... Пасля яго назавуць беларускім Марэсьевым: нягледзячы на ўсе супрацьпаказанні ён хутка стане ў строй. Такому жаданню ваяваць проста не маглі адмовіць.

Аляксандр Лягчылаў вельмі ганарыўся сваім дзядзькам, капітанам I рангу, доктарам ваенна-марскіх навук. Невыпадкова скончыў суворaўскае ў Мінску і нават паступіў у Севастопальскае вышэйшае ваенна-марское вучылішча.

— Паўгода правучыўся і даслаў ліст: «Тата, я еду дадому», — расказвае Вольга Лягчылава. — Як аказалася, як раптам Саша некуды знік, — успамінае Вольга Паўлаўна. — Я — за ім. Гляджу, сядзіць і нешта піша. Прыйшлося нават угаворваць, каб даў паглядзець: такі ён быў у нас сарамлівы. І сёння помню тыя радкі: «Бросайся в море и плыви, как море льнет и гладит кожу. Как это радостно сообщить, что и вода так нежно может нам отдаваться и любить...» Яму тады было гадоў дзесяць.

Слава да Аляксандра Лягчылава прыйшла ў 7 класе. Саюз кампазітараў Беларусі тады шэфстваваў над 39-й школай, дзе вучыўся хлопчык. Аднойчы, калі ў школу прыехаў вядомы кампазітар Юрый Семяняка, дзеці папрасілі яго напісаць атрадную песню. Семяняка пагадзіўся, але з умовай, што словы да песні школьнікі напішуць самі. «Дык у нашага Сашы Лягчылава іх два сшыткі», — адказалі яны кампазітару. Неўзабаве з'явілася атрадная песня — першая ў скарбонцы паэта-песенніка.

— Яе выконвалі па радыё, на розных мерапрыемствах, — гаворыць Вольга Паўлаўна. — Калі я першы раз пачула песню, вы не ўяўляеце, як гэта было ганарова. Дзіця, а ўжо загучаў на ўсю краіну!

Неўзабаве Сашу Лягчылава запрасілі на сустрэчу ў Саюз кампазітараў. Але падлетак не пайшоў: палічыў, што няма чым хваліцца. Але пісаць працягваў.

### Творца з эканамічным ухілам

Пасля няўдалай спробы асвоіць ваенную навуку Аляксандр Лягчылаў пайшоў у армію. Служыў танкістам у Печах, што пад Барысавам. Свой абавязак перад Айчынай выконваў таксама пад музыку: іграў на гітары ў складзе ансамбля, створанага ў воінскай часці.

Другі раз з Юрыем Семянякам ён сустрэўся падчас вучобы на журфаку БДУ. Маэстра прапанаваў Лягчылаву напісаць ужо «дарослы» твор. Неўзабаве на ўсю краіну загучала песня пра Беларусь.

Вучобу на журфаку Лягчылаў сумяшчаў з работай ва ўпраўленні культуры Мінскага аблвыканкама. У навукова-даследчым эканамічным інстытуце Дзяржплана БССР, куды пасля запрасілі Аляксандра Кузьміча, павінны былі стварыць сваю рэдакцыю. Меркавалі, што яе ўзначаліць наваспечаны журналіст. Але нешта не атрымалася, і Аляксандру прапанавалі пасаду вучонага сакратара. Ён пагадзіўся, але вырашыў, што вучоны сакратар павінен мець навуковую ступень. Абараніў у Маскве кандыдацкую дысертацыю і стаў кандыдатам эканамічных навук.

Адну за адной Аляксандр Лягчылаў мяняў высокія пасады. Працаваў памочнікам міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, прарэктарам па навуковай рабоце Беларускага ўніверсітэта культуры, прарэктарам гуманітарнага эканамічнага інстытута. Да апошняга дня свайго жыцця ўзначальваў Мінскі дзяржаўны гандлёвы каледж.

### Стасункі з кампазітарамі і спевакамі

Нягледзячы на сваю занятасць, ён заўсёды знаходзіў час для творчасці. Ужо пасля смерці паэта яго маці даведаецца, што 243 песні Лягчылава маюць ліцэнзію — а значыць рэгулярна выконваюцца. Усяго ж ім напісана каля 400 твораў. Некаторыя з іх уваходзяць у зборнікі «Музыка кахання» і «Астравы шчасця», якія падрыхтавала да выдання Вольга Паўлаўна. Як яна прызналася, яшчэ хопіць не на адзін: многія песні засталіся толькі на паперы. Як, напрыклад, песня «Ты такая адна», прысвечаная планеце Зямля. Магчыма, на яе паэта натхніў знакаміты касманаўт Пётр Клімук. Бо як інакш зразумець, што да аркуша, на якім запісаны словы, прымацавана візітка двойчы Героя Савецкага Саюза?

— Пісаў настолькі хутка, настолькі захапляльна, — успамінае сынаву манеру творчасці бацька. — Няма ніводнага кампазітара, хто б не хацеў напісаць з ім песню. І ён нікому не адмаўляў.

І гэта пацвярджаюць зборнікі, якія я гартаю разам з бацькамі паэта: Лучанок, Захлеўны, Зарыцкі, Прохараў, Молчан, Буднік, Елісеенкаў, Глебаў, Іваноў... «Бывала, нават падказваў кампазітарам, як пабудаваць тую ці іншую мелодыю. Настолькі быў музыкальным. І гэта без музычнай школы!», — удакладняе Вольга Паўлаўна.

Яго песні грэлі душу многім артыстам. Звонкім словам яны ліліся з вуснаў Льва Лешчанкі і Іосіфа Кабзона, Ядзвігі Паплаўскай і Аляксандра Ціхановіча, Іны Афанасьевай, гучалі ў выкананні «Песняроў», «Сяброў», «Верасоў», «Бяседы», ансамбля імя Аляксандрава...

### Сын як сонца

Пры жыцці Аляксандр Лягчылаў правёў 10 творчых вечароў. Кожны раз паэта сустракалі перапоўненыя залы. І заўсёды сярод гэтай вялікай колькасці людзей знаходзіўся самы важны для яго глядач і крытык — мама. Са слязьмі на вачах Вольга Паўлаўна ўспамінае, што нават у тыя вельмі адказныя часіны ён ніколі не забываўся пра яе — заўжды нёс букет кветак.

— Саша быў вельмі добрым і клапатлівым сынам, — успамінае маці. — Калі ў нашай кватэры адчыняліся дзверы і заходзіў ён, здавалася, узыходзіла сонейка.

Сваёй любай матулі Аляксандр Кузьміч прысвяціў не адну песню. Мы гартаем з Вольгай Паўлаўнай песенныя зборнікі і зачытваем кранальныя да болю радкі:

*Мама, мама, матулечка,*
*Знаю, ты — гэта я.*
*Мама, мама, матулечка,*
*Я крывінка твая.*
*Колькі вёснаў не спраўдзіцца,*
*Колькі зім не міне,*
*Божа, мілы, матулю*
*Зберажы для мяне.*

На 50-гадовым юбілеі з дзецьмі.

### Восень жыцця

Аляксандр Кузьміч памёр ва ўзросце 59 гадоў. Анкалогія. Згарэў імгненна. Гэта сёння, праглядаючы яго апошні канцэрт, які адбыўся ў красавіку 2005 года, Вольга Паўлаўна заўважае, што сын ужо хварэў. Тады ж ніхто нават не падазраваў аб страшным дыягназе.

Яго смерць стала вялікім ударам не толькі для бацькоў, а і для дзяцей паэта. Ганна, Павел і Кацярына сёння беражліва захоўваюць памяць бацькі. А старэйшая дачушка яшчэ і праслаўляе яго добрае імя. Ганна Лягчылава — вядомая актрыса і рэжысёр расійскага кінематографа. Такая дачка магла нарадзіцца толькі ў таленавітага бацькі.

Ён пайшоў з жыцця восенню. Менавіта гэтую пару года Аляксандр Лягчылаў любіў больш за ўсё: колькі песень прысвяціў сваёй залатой сяброўцы! І, напэўна, невыпадкова нехта найвышэйшы вырашыў, што самы прыгожы, першы восеньскі месяц стане для яго апошнім...

*Ночы... Ах, якімі сталі ночы!*
*Неба быццам зоркавая шаль.*
*Гэта нас з табою восень хоча*
*Запрасіць на свой чароўны баль.*

*Стане, можа, нам сяброўкай стане*
*Восень, што спяшаецца да нас.*
*І плыве мелодыя кахання,*
*Нібыта гучыць апошні раз.*

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*
**Фота з сямейнага архіва Лягчылавых.**

■ Фотафакт

# НАГОДА ДЛЯ ЎСМЕШКІ

## Выстаўка шаржаў Аляксандра Каршакевіча адкрылася ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча

**Назва экспазіцыі «З усмешкай па жыцці» досыць сімвалічная. Уменне дасціпна жартаваць уласцівае беларускаму народу, нездарма ж у нас казалі: «Смяяцца — не грэх». Любіў жартаваць і Максім Багдановіч, ён нават напісаў цыкл жартоўных вершаў «Усмешкі». Вось і Аляксандр Каршакевіч, выдатны мастак, намеснік галоўнага рэдактара часопіса сатыры і гумару «Вожык» ужо шмат гадоў радуе беларусаў сваімі шаржамі.**

Сам мастак кажа, што вялікую манументальную работу выканаў толькі аднойчы, сёння яна ўпрыгожвае актавую залу адной са сталічных дзіцячых бальніц. А ўсё жыццё прысвяціў справе гумару. Таму і шаржы ў яго — не крыўдныя для іх герояў, хутчэй наадварот — тут бачыцца не толькі ўсмешка і смех, а глыбокае веданне мастаком характару, адметнасцяў творчай натуры герояў гэтых невялікіх таленавітых малюнкаў.

Задуменны, але ўсмешлівы літаратуразнаўца Алег Лойка, какетлівая паэтка Раіса Баравікова, летуценная казачніца Алена Масла... Героямі шаржаў, прадстаўленых на выстаўцы, сталі каля паўтара дзясятка айчынных літаратараў і мастакоў. Дарэчы, кожнага з іх лёгка пазнаць у аўтарскім жартаўлівым выкананні Аляксандра Пятровіча.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

Фота Надзеі БУЖАН.

# ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **Лот №1.**<br>Станок специальный токарный с ЧПУ модель 16ГС 25ФЗС2, 2007 года выпуска, заводской номер 64, инвентарный номер 118151<br>Начальная стоимость лота – 34.117,56 доллара США<br>**Лот №2.**<br>Станок двухосевой универсальный токарный CTX 310 ecoline V3 – New Design, 2012 года выпуска, заводской номер 8044001705E, инвентарный номер 118157<br>Начальная стоимость лота – 52.491, 86 доллара США<br>**Лот №3.**<br>Станок двухосевой универсальный токарный CTX 310 ecoline V3 – New Design, 2012 года выпуска, заводской номер 8044000173 8E, инвентарный номер 118156<br>Начальная стоимость лота – 52.491, 86 доллара США<br>**Лот №4.**<br>Станок консольно-фрезерный с УЦИ модель FSS 450 PLG-00-00, 2010 года выпуска, заводской номер 1, инвентарный номер 121160.<br>Начальная стоимость лота – 25.838,08 доллара США |
| **Собственник (владелец) имущества** | ОАО «Оршанский инструментальный завод», УНП 300207906, юридический адрес: Витебская область, г. Орша, ул. Мира, 39А |
| **Место-нахождение имущества** | г. Орша, ул. Мира, 39А<br>Контактные лица по вопросам осмотра имущества и получения дополнительной информации:<br>Бегляк Александр Сергеевич – т.р. 8 0216 21 64 43, т.м. +37529 365 46 42;<br>Левин Борис Григорьевич – т.м. +37529 716 76 30 |
| **Наличие обременений** | Залог ОАО «Белгазпромбанк» |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома<br>г. Витебск, ул. Богдана Хмельницкого, 10/1<br>25 июля 2016 года в 10.00 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома<br>210015, г. Витебск, ул. Богдана Хмельницкого, д. 10/1, каб. 2.5<br>Судебный исполнитель Богданова Ольга Евгеньевна, тел. (0212) 62 03 40, т.м. 375-33-687-91-63<br>Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 61 40 15 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001053 филиала № 200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 **не позднее 14.00 22 июля 2016 года.**<br>Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота.<br>В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

# ООО «Юридическая группа «СОВЕТНИК» – управляющий по делу о банкротстве ИП «ЛеГранд», извещает о проведении торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего должнику

**Торги состоятся 26 июля 2016 года в 12.00 по адресу: г. Минск, Долгиновский тракт, д. 149а/1, к. 3.**

Для участия в торгах необходимо подать **до 22 июля 2016 года** заявку и перечислить на расчетный счет ИП «ЛеГранд», 3012007546015 в ОАО «Приорбанк», г. Минск, код 749, УНП 101120003 сумму задатка в размере 5% от начальной цены имущества. Сумма шага аукциона по каждому лоту составляет 5% от начальной цены предмета аукциона.

С лотами, выставляемыми на торги, можно ознакомиться по предварительному согласованию по телефону 80173880325. Прием заявок и документов на участие в торгах осуществляет организатор торгов – ООО «Юридическая группа «СОВЕТНИК» – ежедневно по рабочим дням с 9.00 до 18.00 по адресу: 220053, г. Минск, Долгиновский тракт, д. 149а/1, к. 3.

Сведения о дебиторах.

| Номер лота | Сведения об имуществе | Начальная цена, за ед. рублей без НДС | Сумма задатка |
|---|---|---|---|
| 1 | Дверь с автоматическим приводом | 80 000 000 | 4 000 000 |
| 2 | Заготовки обуви (крой для изготовления тапок) | 96 980 000 | 4 849 000 |
| 3 | Инструменты | 24 176 436 | 1 208 822 |
| 4 | Инструменты для производства обуви | 139 447 608 | 6 972 980 |
| 5 | Иные материалы для производства обуви | 527 932 615 | 26 396 631 |
| 6 | Кожтовар | 238 296 976 | 11 914 849 |
| 7 | Комплектующие для обуви | 1 271 852 251 | 63 592 613 |
| 8 | Молнии | 131 602 005 | 6 580 100 |
| 9 | Оргтехника | 42 575 927 | 2 128 796 |
| 10 | Офисная мебель | 21 537 227 | 1 076 861 |
| 11 | Принадлежности для офиса | 59 819 815 | 2 990 991 |
| 12 | Фурнитура | 770 977 324 | 38 548 866 |

Победителем торгов является лицо, предложившее наибольшую цену.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона производится победителем аукциона по фактическим затратам. Все расходы, связанные с регистрацией договора купли-продажи, оформлением перехода права требования, несет покупатель.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

По результатам аукциона организатор торгов составляет протокол в трех экземплярах.

Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 7 рабочих дней с даты проведения торгов.

Организатор вправе отказаться от проведения торгов не менее чем за 3 дня до даты проведения торгов.

С более подробной информацией о порядке, условиях проведения торгов, предметах торгов можно ознакомиться по тел.: +37517 388 03 25.

**КУП ПО ОКАЗАНИЮ УСЛУГ «ГРОДНЕНСКИЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»**
сообщает о **снятии** с аукционных торгов **29 июня 2016 года земельного участка для строительства одноквартирного жилого дома № 87** общей площадью 0,1415 га с кадастровым номером 440100000003005505, расположенного в микрорайоне «Зарица-3». УНП 590727594

# ОСТРОШИЦКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА)

## извещает о проведении 25 июля 2016 года открытого аукциона и повторного по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь (га) | Ограничения в использовании, инфраструктура | Начальная цена (бел. рублей) | Размер задатка (бел. рублей) | Расходы по изготовлению документации (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Чуденичи, ул. Зеленая, 11, кадастровый номер 623286308101000443 | 0,1248 | Район индивидуальной застройки «Чуденичи-2» – вода, электричество, газ; рядом лес | 37 110 800 | 3 711 000 | 17 652 700 |
| 2 | д. Кондратовичи, ул Дорожная, 6, кадастровый номер 623286303101000096 | 0,1350 | Водоохранная зона пруда, в н.п. сети водоснабжения, электроснабжения, газ | 36 889 000 | 3 688 900 | 13 605 000 |
| 3 | д. Ребрище, пер. Центральный, 1 (уч. № 3), кадастровый номер 623286307601000066 | 0,1380 | Охранная зона сетей водоснабжения; в н.п. сети водоснабжения, электроснабжения | 34 201 100 | 3 420 100 | 16 170 000 |

Дата, время и место проведения аукциона: **25 июля 2016 года в 10.00 по адресу: Логойский район, а.г. Острошицы, ул. Центральная, д. 8, Острошицкий сельский исполнительный комитет.**

Прием документов: ежедневно с 8.00 до 17.00 (кроме воскресенья) **по 19.07.2016 г. включительно;** к заявлению прилагается квитанция об оплате задатка и копия личного паспорта.

*Задаток перечисляется на расчетный счет 3600619141101 в ЦБУ 611 филиала № 500 МУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 153001601, УНН 600537220, код платежа 04901, получатель – Острошицкий сельский исполнительный комитет.*

Условия: победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после подписания протокола о результатах проведения аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона.

**Контактные телефоны: (801774) 57 6 21, 57 6 35, 57 6 36; (+37529) 644 48 86.**

Департамент по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
**ЗАРЕГИСТРИРОВАНО**
23 июня 2016
Сушко С.А.

# ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОСПЕКТ ЭМИССИИ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ ТРЕТЬЕГО ВЫПУСКА

Совместное общество с ограниченной ответственностью «ВильнюсСтрой»

**УТВЕРЖДЕНО**
Протокол внеочередного Общего собрания участников Совместного общества с ограниченной ответственностью «ВильнюсСтрой» от 10 июня 2016 года

Внести в Проспект эмиссии жилищных облигаций третьего выпуска следующие изменения:

1. пункт 1.15 изложить в следующей редакции:

«1.15. Сотрудник Эмитента, имеющий квалификационный аттестат на право деятельности на рынке ценных бумаг: ведущий юрисконсульт Пикарева Елена Валентиновна, квалификационный аттестат 3 категории №5200-3-17439 от 13.05.2015 (срок – до 13.05.2020); тел. раб. +375(17) 222-79-80; тел. моб. +375(29) 655-56-33.»;

2. в пункте 2.4:

2.1. подпункт 2.4.1 изложить в следующей редакции:

«2.4.1. Исполнение обязательств по Облигациям обеспечивается поручительством следующих юридических лиц:

- Закрытого акционерного общества «МОРТЕКС БЦЗ» в сумме 5 490 000 000 (пять миллиардов четыреста девяносто миллионов) белорусских рублей в соответствии с договором о предоставлении поручительства от 01 декабря 2014 года №01/12/П в редакции дополнительного соглашения от 22 мая 2015 года №1 и дополнительного соглашения от 10 июня 2016 года №2.

Место нахождения Закрытого акционерного общества «МОРТЕКС БЦЗ»: 220039, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Воронянского, 7А, 7 этаж, кабинет 716; УНП 101186296.

Стоимость чистых активов Закрытого акционерного общества «МОРТЕКС БЦЗ» на 01 января 2016 года составляет 8 245 000 000 (восемь миллиардов двести сорок пять миллионов) белорусских рублей;

- Совместного закрытого акционерного общества «БЕЛКАРГО» в сумме 10 675 000 000 (десять миллиардов шестьсот семьдесят пять миллионов) белорусских рублей в соответствии с договором о предоставлении поручительства от 22 мая 2015 года №22/05П в редакции дополнительного соглашения от 10 июня 2016 года №1.

Местонахождение Совместного закрытого акционерного общества «БЕЛКАРГО»: 220039, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Воронянского, 7А, 1 этаж; УНП 100344404.

Стоимость чистых активов Совместного закрытого акционерного общества «БЕЛКАРГО» на 01 января 2016 года составляет 14 790 424 250 (четырнадцать миллиардов семьсот девяносто миллионов четыреста двадцать четыре тысячи двести пятьдесят) белорусских рублей.

Договоры о предоставлении поручительства вступают в силу с момента их подписания Эмитентом и поручителями и действуют в течение всего срока обращения Облигаций, а также в течение 3 (трех) месяцев после окончания срока обращения Облигаций. Действие договоров о предоставлении поручительства прекращается (в зависимости от того, какое событие (срок) наступит ранее) после исполнения обязательств по Облигациям (в том числе досрочного погашения всего выпуска Облигаций) либо по истечении 3 (трех) месяцев после окончания срока обращения Облигаций, если владельцы Облигаций не предъявят в указанный трехмесячный срок требований о выплате денежных средств по Облигациям к Эмитенту или поручителю.»;

2.2. в подпункте 2.4.2:

2.2.1. в абзаце втором части второй слово «поручителя» заменить словом «поручителей»;

2.2.2. абзац третий части третьей изложить в следующей редакции:

«- после внесения изменений в Решение о выпуске Облигаций и Проспект эмиссии Облигаций и государственной регистрации таких изменений в Департаменте по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь в установленном законодательством порядке.»;

2.2.3. часть четвертую после слов «газете «Звязда» дополнить словами «, а также размещает соответствующую информацию на едином информационном ресурсе рынка ценных бумаг.»;

3. в абзаце шестом подпункта 2.8.4 пункта 2.8 слово «поручителя» заменить словом «поручителей»;

4. абзац третий части второй подпункта 4.2.5 пункта 4.2 изложить в следующей редакции:

«2. Обеспечение эмиссии третьего выпуска Облигаций поручительством в соответствии с договором о предоставлении поручительства от 01 декабря 2014 года №01/12/П в редакции дополнительного соглашения от 22 мая 2015 года №1 и дополнительного соглашения от 10 июня 2016 года №2, заключенным с Закрытым акционерным обществом «МОРТЕКС БЦЗ», и договором о предоставлении поручительства от 22 мая 2015 года №22/05П в редакции дополнительного соглашения от 10 июня 2016 года №1, заключенным с Совместным закрытым акционерным обществом «БЕЛКАРГО».».

ОТ ЭМИТЕНТА:
Директор СООО «ВильнюсСтрой» Н.М.Яколцевич
Главный бухгалтер СООО «ВильнюсСтрой» Т.С.Журавская

ОТ ЛИЦ, ПРЕДОСТАВИВШИХ ОБЕСПЕЧЕНИЕ:
Подтверждаю достоверность информации об обеспечении:
Директор ЗАО «МОРТЕКС БЦЗ» С.В.Сильченко

Подтверждаю достоверность информации об обеспечении:
Директор СЗАО «БЕЛКАРГО» Е.В.Пикарева

ОТ ПРОФУЧАСТНИКА:
Директор ЗАО «Генеральная система инвестиций» Н.Л.Черник

Центр Промышленной Оценки
- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | **ОАО «Газпром трансгаз Беларусь»,** г. Минск, ул. Некрасова, 9 |
| **Вид аукциона** | **Аукцион по комбинированной схеме (сначала на понижение, затем на повышение цены недвижимого имущества)** |

**Предмет аукциона**

| Лот№ | Наименование | Адрес |
|---|---|---|
| 1-10 | Машино-место № 121, № 123, № 127, № 129, № 131, № 132, № 133, № 136, № 137, № 138 | г. Минск, пр-т Независимости, 168/3-1г |

Лоты № 1–10 расположены в подземной автостоянке, общ. пл. 6299,0 кв.м с инвентарным № 500/D-70793116

| | |
|---|---|
| **Начальная цена с НДС 20% каждого Лота – 297 000 000 белорусских рублей (29 700 руб. 0 коп.)** | **Шаг понижения цены: 14 850 000 белорусских рублей (1 485 руб. 0 коп.)** |
| **Минимальная цена с НДС 20% каждого Лота – 252 450 000 белорусских рублей (25 245 руб. 0 коп.)** | **Шаг повышения цены: 14 850 000 белорусских рублей (1 485 руб. 0 коп.)** |

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по оценке имущества на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. **Задаток перечисляется на р/с 3012078700010, ЦБУ №2 ЗАО «МТБанк», г. Витебск, ул. Ленина, 17, БИК 153001117, УНП 390477566, получатель платежа – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Дополнительную информацию можно получить по тел: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.

КОММУНАЛЬНОЕ УНИТАРНОЕ ПРЕДПРИЯТИЕ

## «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

**в целях изучения спроса сообщает о предстоящем проведении аукционов в отношении следующих земельных участков:**

- на территории Национального аэропорта Минск для строительства бизнес-центра с гостиницей и многоуровневым паркингом;
- по пр. Независимости, 93Б для размещения объекта административного назначения;
- в районе ул. Нововиленской для размещения многофункционального комплекса;
- по просп. Рокоссовского – 2-му Велосипедному переулку для размещения объекта общественного питания быстрого обслуживания с линией автораздачи;
- по просп. Дзержинского – ул. Уманской для размещения объекта общественного питания быстрого обслуживания с линией автораздачи;
- по ул. Есенина – ул. Рафиева для размещения объекта общественного питания быстрого обслуживания с линией автораздачи;
- по ул. Л. Украинки – ул. Радужной для размещения объекта общественного питания быстрого обслуживания с линией автораздачи;
- по ул. Аранской – ул. Индустриальной для размещения объекта общественного питания быстрого обслуживания с линией автораздачи.

Телефон для справок +375 17 226-16-72.

УНП 190398583

ОБЪЯВЛЕНИЕ

# ПУХОВИЧСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность для коллективного садоводства, который состоится 29 июля 2016 г. в 15.00 в зале заседаний райисполкома, расположенного по адресу: Минская область, Пуховичский район, г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 47, 2-й этаж, к. 227**

НА АУКЦИОН БУДУТ ВЫСТАВЛЕНЫ:

**ЛОТ 1** – земельный участок (кадастровый номер 624483400006000008), расположенный по адресу: Минская область, Пуховичский район, Дукорский сельсовет, СТ «Полюшко», 106, площадь – 0,1090 га, для коллективного садоводства в садоводческом товариществе «Полюшко», начальная цена – 16 077 151 рубль в денежных знаках образца 2001 года (1607,72 рубля в денежных знаках образца 2009 года), размер задатка для участия в аукционе – 1 607 715 рублей в денежных знаках образца 2001 года (160,77 рубля в денежных знаках образца 2009 года).

Расходы, связанные с подготовкой документации и организацией аукциона, – 10 172 502 рубля в денежных знаках образца 2001 года (1017,25 рубля в денежных знаках образца 2009 года). Дополнительно возмещаются расходы за размещение объявления в газете «Звязда».

Участок имеет ограничения в использовании в связи с расположением его части в охранной зоне электрических сетей.

В садоводческом товариществе имеется электроснабжение.

**ЛОТ 2 –** земельный участок (кадастровый номер 624485700033000064), расположенный по адресу: Минская область, Пуховичский район, Руденский поссельсовет, СТ «Остров-Дружный», 9, площадь – 0,1001 га, для коллективного садоводства в садоводческом товариществе «Остров-Дружный», начальная цена – 18 954 335 рублей в денежных знаках образца 2001 года (1895,43 рубля в денежных знаках образца 2009 года), размер задатка для участия в аукционе – 1 895 434 рубля в денежных знаках образца 2001 года (189,54 рубля в денежных знаках образца 2009 года).

Расходы, связанные с подготовкой документации и организацией аукциона, – 10 172 502 рубля в денежных знаках образца 2001 года (1017,25 рубля в денежных знаках образца 2009 года). Дополнительно возмещаются расходы за размещение объявления в газете «Звязда».

Участок имеет ограничения в использовании в связи с расположением его части в охранной зоне электрических сетей.

В садоводческом товариществе имеется электроснабжение.

**ЛОТ 3 –** земельный участок (кадастровый номер 624483400002000086), расположенный по адресу: Минская область, Пуховичский район, Дукорский сельсовет, СТ «Горки-1», 76, площадь – 0,1000 га, для коллективного садоводства в садоводческом товариществе «Горки-1», начальная цена – 13 753 080 рублей в денежных знаках образца 2001 года (1375,31 рубля в денежных знаках образца 2009 года), размер задатка для участия в аукционе – 1 375 308 рублей в денежных знаках образца 2001 года (137,53 рубля в денежных знаках образца 2009 года).

Расходы, связанные с подготовкой документации и организацией аукциона, – 10 125 133 рубля в денежных знаках образца 2001 года (1012,51 рубля в денежных знаках образца 2009 года). Дополнительно возмещаются расходы за размещение объявления в газете «Звязда».

В садоводческом товариществе имеется электроснабжение и водоснабжение.

Желающим участвовать в аукционе необходимо внести соответствующий размер задатка на счет финансового отдела Пуховичского райисполкома, ф-л 500 – Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк» (код 601), сч. № 3600625000021, код платежа – 04616.

**Участники аукциона должны предоставить следующие документы:**

- заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;
- заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка.

**Кроме того, представляются:**

- гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;
- индивидуальным предпринимателям – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;
- представителям гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;
- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
- представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
- представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Заявление на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 47, Пуховичский райисполком, 2-й этаж, к. 220 с 18 июля 2016 г. по 22 июля 2016 г. с 8.00 до 13.00 по рабочим дням.**

**Заключительная регистрация – с 14.30 до 14.55 в день проведения аукциона по адресу: Минская обл., г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 47, 2-й этаж, к. 227, зал заседаний райисполкома.**

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победитель аукциона вносит плату за право заключения договора аренды земельного участка: возмещает расходы, связанные с проведением аукциона и государственной регистрацией в отношении созданного земельного участка; получает разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительного проекта на строительство объектов в срок, не превышающий два года.

Участники аукциона предварительно могут ознакомится с земельными участками, которые предлагаются для продажи в частную собственность для коллективного садоводства по результатам аукциона, путем выезда на место нахождения земельного участка.

**Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 47, к. 220, контактный тел.: 8 01713 35879 с 8.00 до 13.00 по рабочим дням.**

# ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества** | **ЛОТ № 1.** Диагностическое оборудование «ТЕХА707241» с ноутбуком стоимостью 53 212 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 2.** Домкрат пневмагидравлический стоимостью 3 904 000 рублей.<br>**ЛОТ № 3.** Компрессор с ресивером стоимостью 14 940 000 рублей |
| **Собственник (владелец) имущества** | **ЧТУП «Сергее В»** |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | **г. Орша, ул. 1 Мая, д. 129а** |
| **Информация об обременениях** | **Не имеется** |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | **20.07.2016 года в 10 часов 00 минут г. Орша, ул. Островского, 36, кабинет 12** |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Отдел принудительного исполнения Оршанского района и города Орши, 211030, ул. Островского, 36<br>Судебный исполнитель Рожанская Кристина Викторовна, тел.: 8 021 654 32 12, 375 33 399 83 12.<br>Начальник отдела Павлюченкова Наталья Евгеньевна, тел. 8 021 654 32 13 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) не депозитный счет отдела принудительного исполнения Оршанского района и города Орши № 3642903000794, УНН 300002505 Оршанского отделения АСБ «Беларусбанк», код 647 **не позднее 16.00 19.07.2016 г.**<br>Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота.<br>В соответствии с ч. 3 ст. 401 ХПК Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги |

# РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА»

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 6 июля 2016 г. ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО**

## УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги»

| № лота | Наименование, местоположение и краткая характеристика имущества | Начальная цена продажи, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Общая площадь, м² | Коэф. от 0,5 до 3,0 | Цель использования |
|---|---|---|---|---|---|---|
| ЛОТ №2.6 | Помещение (часть пола) в пассажирском здании на станции Барановичи – Центральные, по адресу: Брестская обл., г.Барановичи, ул. Вильчковского, 3Б | 36 000 | 3 600 | 1,2 | 3,00 | Для размещения банкомата с передней загрузкой, отдельно стоящий. Условия организации электроэнергии – согл. действующего законодательства |

| | |
|---|---|
| **Предмет аукциона** | Право заключения договора аренды |
| **Наименование арендодателя** | УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» |
| **Срок договора** | Не менее 3 лет |
| **Условия** | 1. С победителем аукционных торгов, в течение 10 рабочих дней будет заключен договор аренды помещения;<br>2. Стоимость права заключения договора аренды должна быть выплачена продавцу в течение 3 раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона за вычетом задатка<br>3. Возместить Организатору аукционных торгов расходы по их проведению в течение 3 раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012105618108 в рег. дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску, код 369, УНП 102353509 |

**Аукцион состоится 6 июля 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**1.** Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях.

**2.** Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.

**3.** Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

**4.** Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий его полномочия).

**5.** Индивидуальным предпринимателям - копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

**6.** При подаче документов на участие в аукционе представители участникв, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

***Размер штрафных санкций, предусмотренных Указом Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 (в ред. Указов Президента Республики Беларусь от 11.12.2009 г. №624, от 23.09.2011 г. №431, от 10.01.2013 г. №14) составляет 10 базовых величин.***

**Последний день приема заявлений – 5 апреля 2016 г. до 16.00.**

**Контактные тел.: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, 8 029 6267252.**

# СЛОНИМСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРЕДОСТАВЛЕНИЮ ПОВЕРХНОСТНОГО ВОДНОГО ОБЪЕКТА В АРЕНДУ ДЛЯ РЫБОВОДСТВА**

| Наименование | Поверхностный водный объект |
|---|---|
| **Экологический статус** | Поверхностный водный объект является проточным. Заполнение происходит за счет установленной дамбы на реке Береза, талых вод и атмосферных осадков. Форма водосбора пруда вытянута с юга на север длиной 1200 м, середина пруда разделена дорогой и дамбой. Средняя ширина составляет 250 м, береговая линия пруда около 3330 м. В средней части преобладают глубины 1,5 м, максимальная глубина у водосбора около 4 м |
| **Общая площадь, га** | 29,3 |
| **Месторасположение объекта** | В Слонимском районе, Гродненской области в 12 км на северо-западном направлении от города Слонима, у агрогородка Сеньковщина |
| **Срок аренды** | 5 лет |
| **Начальная цена объекта аукциона** | 1460 руб. 38 коп. (до деноминации 14 603 800 рублей) |
| **Сумма задатка** | 292 руб. 08 коп. (до деноминации 2 920 800 рублей) |
| **Стоимость затрат по организации и проведению аукциона** | 253 руб. 20 коп. (до деноминации 2 532 000 рублей) |

Аукцион состоится **27 июля 2016** года в 10 часов 00 минут **по адресу: 231800, г. Слоним, ул. Красноармейская, 40, каб. 619.**

Аукцион проводится на основании Положения о порядке проведения торгов по предоставлению поверхностных водных объектов в аренду для рыбоводства, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 15 октября 2015 г. № 861 «Об утверждении Положения о порядке проведения торгов по предоставлению поверхностных водных объектов в аренду для рыбоводства». Водный объект предоставляется в аренду для товарного рыбоводства и рыбоводства в рекреационных целях.

Для участия в аукционе юридическое или физическое лицо, в том числе индивидуальный предприниматель в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием сведений о поверхностном водном объекте, который участник торгов желает получить в аренду по результатам аукциона.

К заявлению прилагаются:

- копия платежного поручения, квитанции или иного документа, подтверждающего внесение задатка в сумме 20% начальной цены.

Сумма задатка вносится на р/с Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Гродненской области № 3600525000013 в ЦБУ № 422 филиала № 402 ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Слониме, код 689, УНН 500563252, код платежа 04004.

- доверенность представителя участника аукциона и копия документа, подтверждающего его личность, в случае, если заявление подписывается не участником аукциона;
- копии учредительных документов и копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица;
- копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя;
- копия паспорта гражданина.

Условием проведения аукциона является наличие не менее двух участников.

В случае, если при проведении торгов в виде аукциона они признаны несостоявшимися в силу того, что заявление подал только один участник или для участия в нем явился только один участник, договор аренды поверхностного водного объекта заключается с этим участником при его согласии по начальной цене ежегодной арендной платы, увеличенной на 5 процентов.

Решение комиссии по результатам аукциона оформляется протоколом.

Протокол подписывается председателем и членами комиссии в день проведения аукциона.

Участники торгов должны быть ознакомлены с протоколом аукциона в течение пяти рабочих дней после его проведения.

Участникам аукциона, не выигравшим аукцион, задаток должен быть возвращен в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

Участнику, выигравшему аукцион, сумма внесенного задатка учитывается в счет исполнения обязательств по договору, заключаемому по результатам аукциона.

Слонимский районный исполнительный комитет (далее райисполком), вправе отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

В случае отказа от проведения аукциона райисполкомом, проводящим аукцион, задаток участникам должен быть возвращен в течение пяти дней после объявления райисполкомом об отказе от проведения аукциона.

Возмещение затрат райисполкому на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с разработкой и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения, осуществляется участником аукциона, выигравшим аукцион, в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона. Размер такого возмещения не должен превышать суммы фактических затрат на организацию и проведение аукциона, разработку документации, необходимой для их проведения, а также включать затраты по ранее проведенным нерезультативным аукционам в случае повторного выставления объекта на аукцион.

Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения в обязательном порядке доводится до сведения участников аукциона до начала его проведения.

Документы для участия в аукционе принимаются по адресу: г. Слоним, ул. Красноармейская, 40, каб. № 328 Слонимского райисполкома с 8.30 до 17.00 по рабочим дням. Телефоны для справок: 8 (01562) 5-05-51; 5-07-09. **Заявления принимаются по «25» июля 2016 г. до 16.00 включительно.**

УНП 500021638

**УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ**

## ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш»

**05 июля 2016 года**

**СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш», расположенного по адресу: г. Лида, ул. Советская, 70 в 12.00 (конференц-зал) (собрание проводится в очной форме)**

**Повестка дня собрания:**

1. О выплате дивидендов по итогам работы Общества за 2015 год.
2. О сделке Общества, в совершении которой имеется заинтересованность его аффилированных лиц.

*Наблюдательный совет ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш»*



**Па гарызанталі:** **5.** Артыст, які агучыў ката Матроскіна. **6.** Касынка байкера. **8.** Песня венецыянскіх гандальераў. **11.** Падарожнік па выцвярэзніках. **14.** Архітэктурны стыль. **15.** Самы гнуткі цыркач. **16.** Месца для хору ў царкве. **17.** Балетны выкрутас. **20.** Азіяцкая сталіца, якую называюць «горадам анёлаў». **22.** Спінная частка вэнджанай рыбы. **23.** Танцы ў пачках. **26.** Той, хто не працуе, а есць. **27.** Трава, якая кусаецца. **28.** Распрадажная паніка.

**Па вертыкалі:** **1.** Беларускі струнны смычковы музычны інструмент. **2.** Кавальская печ. **3.** Тата, які ўмее сам стругаць сабе дзяцей. **4.** «Маці парадку». **7.** Дрэватаўстун абхватам у сорак метраў. **9.** Коннае войска. **10.** Еўрапейскі «горад мастоў». **12.** Джыгіт на пенсіі. **13.** Царства Навухаданосара. **18.** Краіна пірамід. **19.** Дошчачка мастака для змешвання фарбаў. **21.** Вадаплаўная птушка з мяшком пад дзюбай. **24.** Салодкі ласунак з чайханы. **25.** Дзяржава ў Акіяніі са сталіцай Сува.

**Склала Таццяна КУЗЬМІЧ.**

*г. Віцебск.*

**Праверце, калі ласка, адказы**

**Па гарызанталі:** **5.** Табакоў. **6.** Бандана. **8.** Баркарола. **11.** Алкаш. **14.** Ампір. **15.** Акрабат. **16.** Клірас. **17.** Піруэт. **20.** Бангкок. **22.** Балык. **23.** Балет. **26.** Нахлебнік. **27.** Крапіва. **28.** Ажыятаж.

**Па вертыкалі:** **1.** Басэтля. **2.** Горан. **3.** Карла. **4.** Анархія. **7.** Баабаб. **9.** Кавалерыя. **10.** Амстэрдам. **12.** Аксакал. **13.** Вавілон. **18.** Егіпет. **19.** Палітра. **21.** Пелікан. **24.** Халва. **25.** Фіджы.

## ■ Будзь у курсе!

### ХТО Ў ВАДАЁМЕ — «ЧЫРВАНАКНІЖНІК»?

**Каб рыбакам было прасцей адрозніць «чырванакніжнікаў» ад астатніх рыб, у Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь распрацоўваюць спецыяльны каляндар на 2017 год.**

Нягледзячы на тое, што ўзятых пад ахову відаў у краіне не так і шмат (усяго дзевяць), мала хто ведае іх адметныя прыкметы і можа вылучыць «чырванакніжнікаў» сярод іншых рыб.

У календары будуць размешчаны фотаздымкі сцерлядзі, атлантычнага ласося, еўрапейскага харыуса, кумжы, ручаёвой стронгі, еўрапейскай корушкі, азёрнага гальяна, звычайнага вусача і рыбца. Акрамя таго, у яго вырашана ўключыць рачную міногу і шыракапалага рака (таксама «чырванакніжнікаў»), а яшчэ вугра, аматарская лоўля якога ў Беларусі забаронена.

Водных насельнікаў прадставяць у розных ракурсах, каб іх можна было разгледзець дэталёва і вылучыць адметныя асаблівасці. Да таго ж будзе прысутнічаць тэкставае апісанне. У электронным выглядзе каляндар з'явіцца на сайце Дзяржінспекцыі, каб усе ахвотныя мелі магчымасць азнаёміцца з ім. Дарэчы, апісанні некаторых «чырванакніжнікаў» можна знайсці на сайце ўжо цяпер. Вызначальнік асобных відаў рыб, якія жывуць у водах Беларусі, прадастаўлены Навукова-практычным цэнтрам па біярэсурсах Нацыянальнай акадэміі навук.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

Суботнік
з Вожыкам

Усмешкі

### Не забірай!

Участковы інспектар складае пратакол на самагоншчыцу.

— Цяпер, Кацярына, — кажа ён, — давядзецца заплаціць вялікі штраф.

— А ты, шаноўны, — просіць тая, — не забірай самагонку. Прадам яе ды заплачу гэты штраф.

### Навічок

Злавілі кішэннага злодзея. Ён слязліва просіць:

— Адпусціце, добрыя людзі, я навічок без вопыту работы!..

**Даслаў Віктар ЛОЎГАЧ.**

*Гомельская вобласць, г. п. Акцябрскі.*

Філалогія і дэмагогія

*Фельетон*

У невялікім пакойчыку суда заслухоўвалася справа аб адміністрацыйным правапарушэнні па артыкуле «Паклёп». Спачатку суддзя зачытаў уступнае слова, асаблівасці справы. Затым прапанаваў выступіць пацярпелай Куліковай.

— Добры дзень, мяне завуць Зінаіда Пятроўна. Я філолаг, — з гонарам у голасе пачала яна даваць паказанні. — Мы з сястрой Анжэлай жывём па суседстве ў прыватным сектары недалёка ад Мінска. Вечарам дваццатага мая я ніяк не магла выбраць кнігу. Душа мітусілася паміж эпісталярнай спадчынай Дастаеўскага і творчасцю паэтаў Мадагаскара. Тут прыбягае мой сын Жэня, усхваляваны і напалоханы. Аказваецца, Анжэла абразіла хлопчыка, і цяпер ён стаіць на парозе анарэксіі, цураецца аднагодкаў. Мне няёмка казаць, але яна параўнала маю крывінку з чартапалохам. Як вядома, у «Слоўніку сімвалаў» Джэка Трэсідара гэтая расліна згадваецца як эмблема пакутніцтва. Атрымліваецца, што сын — пакаранне для мяне?

Суддзя здзіўлена лыпаў вачыма і нічога не разумеў. Ён, праўда, заўсёды падазраваў, што ёсць асаблівы від логікі — суб'ектыўная, якая існуе толькі ва ўяўленні яе ўладальніка. Але зараз на прыкладзе Куліковай упэўніўся ў гэтай думцы. А Зінаіда Пятроўна працягвала сваю прамову:

— Акрамя таго, сястра параўнала майго сына з малпай. Гэта сімвал заганы і злачынных намераў! А майму Жэньку толькі дванаццаць гадоў! — Кулікова ліхаманкава перабірала раздрукаваныя старонкі. — Яшчэ Анжэла сказала, што мой сын — свіння! Яна ж асацыюецца з тыраніяй! Вы толькі падумайце, якая абраза!

Зінаіда Пятроўна з горда ўзнятай галавой скончыла сваё выступленне і ўселася на месца. Далей слова далі Анжэле. Тая паднялася і, сарамліва гледзячы ў падлогу, пачала апраўдвацца:

— Паважаны суддзя, я сказала Жэні, што ён учэплівы, як лопух, і адмовілася даваць грошы, якія падлетак забягае прасіць у мяне па некалькі разоў на тыдзень. Мне, вядома, не шкада, але ж пляменнік у нейкі момант пачаў успрымаць гэта як належнае, нават не дзякаваў. Вось я і сказала, каб ён перастаў паводзіць сябе па-свінску. Жэня ж у адказ пачаў крыўляцца. У мяне і вырвалася, што ён паводзіць сябе, як малпа.

Кулікова закруцілася на сваім месцы. З аднаго боку, яна абуралася, што сын перастаў выглядаць ахвярай цёткі, а з другога — радавалася, бо яе словы пацвярджаліся. Калі Анжэла села на месца, то Зінаіда Пятроўна імгненна падхапілася і выкрыкнула:

— Звярніце ўвагу, таварыш суддзя, мая сястра яшчэ параўнала Жэню з клоўнам. А яны ўвасабляюць чалавечыя няўдачы, паказваюць, як сур'ёзнасць пераўтвараецца ў фарс. Тым самым мая сястра намякнула, што я пацярпела няўдачу ў выхаванні сына! Вы ўяўляеце адчуванні Жэні, калі ён чуў такія несправядлівыя абразы?

— Я не гэта мела на ўвазе, Зіна! Чаго ты да слоў чапляешся? Мы ж дзве крывінкі, а тут на пустым месцы... — ледзь не плачучы, казала Анжэла.

У пакойчыку загаманілі прысутныя, суддзі спатрэбілася некалькі хвілін, каб усталяваць цішыню.

Далей былі выступленні сведак, якія блыталіся ў паказаннях. Шматлікія выпады Куліковай, калі ход працэсу не адпавядаў яе ўяўленням пра справядлівасць. І стомлены позірк суддзі, які яшчэ раз пераканаўся, што няма межаў чалавечай дурасці...

**Алена КЕДА.**

*г. Мінск.*

Міранізмы

### Рэаліст

Мінае ўсё,
Як з яблынь дым...
Я вопытны,
Не веру ў цуды:
Ужо не буду маладым,
А хутка —
І старым не буду!

### Страхоўка

Высновы робім мы
З падзей:
Багацце ўсё ж
Псуе людзей.
Я ад таго
Застрахаваны —
Памру, падобна,
Непсаваны...

### Такім і застаўся

Мне згадваюцца
Школьныя гады,
Калі жыцця не ведаў,
Шмат пытаўся...
З дзяўчатамі
Я дурнем быў тады,
А зрэшты, з імі дурнем
І застаўся.

### Інтарэс

Нахабная муха
Ў пакой заляцела
І, каб адпачыць,
Мне на лысіну села.
Хто б іншы прагнаў,
Але я не чапаю —
Хаця б для каго
Інтарэс уяўляю!..

### Выпрабаванне славай

Долю ўласную
Лічу цікавай,
Спасцігаю сэнс жыцця
І сутнасць.
Я прайшоў
Выпрабаванне славай —
Лёгка вытрымаў
Яе адсутнасць.

### Вернасць

Пра ворагаў
Скажу адно:
Яны мне
Вернасць зберагаюць.
Сябры пакінулі
Даўно,
А ворагі
Не пакідаюць.

### Кругленькая сума

Не баюся болей
Крызісу і буму,
І чакаць дэфолту
Мне няма адкуль.
На рахунку маю
Кругленькую суму:
У мяне там сёння —
Абсалютны нуль.

**Міхась МІРАНОВІЧ.**

### Анекдоты

**Самы просты спосаб растлумачыць дзецям, што такое падаткі, гэта з'есці 20% іх марожанага!**

☺ ☺ ☺

— Тата, а чаму на карце мяжа пазначаецца як кропка-працяжнік, кропка-працяжнік?

— Гэта геаграфічны сімвал: сабака-памежнік, сабака-памежнік...

☺ ☺ ☺

**Каб сказаць гістарычную фразу, вы павінны быць гістарычнай фігурай.**

☺ ☺ ☺

З інтэрв'ю:

— Як вы праводзіце свой вольны час?

— На працы ці ў цэлым?



# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

СМАЧНА ЕСЦІ!

## Халаднік. 5 незвычайных рэцэптаў

**1. На сыраквашы**

***Спатрэбіцца:*** *на літр сыраквашы — 3 яйкі, 3 агуркі, па пучку кропу, пятрушкі, кінзы, зялёнай цыбулі, 1 зубок часнаку, соль, перац.*

Агуркі і яйкі дробна парэзаць, зеляніва дробна пасекчы, усе інгрэдыенты высыпаць у сыраквашу. Пасаліць, паперчыць, для вастрыні дабавіць здробнены часнок.

**2. З агародніны**

***Спатрэбіцца:*** *на паўтара літра хлебнага квасу — 6-7 вараных бульбін, 3 вараныя яйкі, вараная морква, пучок радыскі, 3 агуркі, цыбуліна, 2 сталовыя лыжкі смятаны, кроп, на смак — соль, цукар, гарчыца.*

Агуркі, радыску, бульбу, моркву нарэзаць, нашаткаваць кроп. Жаўткі расцерці са смятанай, гарчыцай, а бялок пасекчы і дабавіць у асноўную масу, развесці халодным хлебным квасам. Атрыманай сумессю заліць падрыхтаваную гародніну.

**3. Зборны**

***Спатрэбіцца:*** *на паўтара літра хлебнага квасу — 200 г адварной цяляціны, 200 г вяндліны, 5 агуркоў, 2 вараныя яйкі, 3 сталовыя лыжкі смятаны, хрэн, соль, зеляніва.*

Дробна нарэзаць мяса, вяндліну, агуркі і яйкі. Пасечанае зеляніва пасаліць і патаўчы, старанна перамяшаць з хрэнам і невялікай колькасцю смятаны. Усе інгрэдыенты змяшаць, заліць квасам. Падаваць са смятанай.

**4. На скорую руку**

***Спатрэбіцца:*** *на паўтара літра халоднай вады — лімон, 3 вараныя яйкі, 2 агуркі, пучок радыскі, на смак — смятана, зеляніва, соль, перац.*

Нарэзаць яйкі, агурок, радыску, дадаць пасечанае зеляніва і смятану, усё старанна перамяшаць. Атрыманую сумесь раскласці па талерках, заліць халоднай вадой з лімонным сокам.

**5. Грыбны**

***Спатрэбіцца:*** *на паўтара літра хлебнага квасу — 300 г марынаваных грыбоў, 200 г варанай ялавічыны, 6 вараных бульбін, 1 вараная морква, 2 вараныя яйкі, 2 свежыя агуркі, сталовая лыжка гарчыцы, 2 сталовыя лыжкі смятаны, па пучку кропу, пятрушкі і зялёнай цыбулі.*

Грыбы памыць халоднай вадой, даць сцячы вадзе, затым нарэзаць на дробныя кубікі, дабавіць здробненыя ялавічыну, агурок, моркву, бульбу. Жаўткі расцерці з гарчыцай і невялікай колькасцю смятаны, а бялок пасекчы і ўкінуць у асноўную масу. Падрыхтаваную сумесь заліць квасам, заправіць жаўткамі з гарчыцай, пасечаным зеленівам, пасаліць.

ЧЫСЦЮЛЯ

## СЕЗОН БЕЛАГА

**Як правільна мыць летняе адзенне**

*Перш за ўсё рассартуйце яго па відах тканіны і прачытайце надпісы на этыкетках.*

*Белае*

Не забывайце правіла: белае мыць асобна ад каляровага. Нават пастэльна-ружовы можа ператварыць белую сукенку ў шэрую. Аптымальная тэмпература пры мыцці тканін з віскозы ці з прымессю сінтэтыкі — 30 градусаў. Ад занадта гарачай вады такія рэчы пашарэюць. Як пры ручным, так і пры машынным мыцці белае рэкамендуецца замочваць у цёплай вадзе з парашком на 4-5 гадзін. Пажоўклыя рэчы можна адбельваць з дапамогай спецыяльных сродкаў, а таксама старым праверaным спосабам — пераксідам вадароду. Для гэтага ў вядры цёплай вады трэба растварыць 3 ст. л. пераксіду. Замачыць рэчы на дзве гадзіны, пасля двойчы прапаласкаць і павесіць сушыцца на сонцы. Сонечныя прамяні — выдатны натуральны адбельвальнік.

*З бавоўны*

Баваўнянай бялізне можна вярнуць першапачатковы выгляд з дапамогай замочвання на суткі ў аднаўляльным растворы — па 4 ст. л. пральнага парашку і шкіпінару на кожныя 10 л вады.

*З лёну*

Ільняныя рэчы трэба замочваць двойчы. Спачатку ўсяго на паўгадзіны, у цёплай вадзе з пральным парашком. Затым ваду зліць, бялізну адціснуць і замачыць зноў — яшчэ на паўгадзіны. Белыя ільняныя рэчы мыюць у машыне пры 60 градусах. Каляровыя — пры 30-40 °С. Каб рэч не аблезла, у ваду дабаўце соль — 1 ст. л. на кожныя 10 л вады. Лён будзе менш садзіцца пасля мыцця, калі сушыць яго не ў машыне, а на паветры. Белыя ільняныя рэчы можна адбельваць і бабуліным спосабам — кіпячэннем. На 10 л вады — 10 г парашку і 10 г адбельвальніку. Трэба давесці да кіпення і пакінуць на 20 хвілін. Затым як след прапаласкаць, выкруціць і павесіць.

*Футболкі з малюнкам*

Рэчы з прынтам неабходна мыць навыварат. Абавязкова прачытайце надпісы на парашку — ніякага адбельвальнага эфекту! Калі на футболцы з малюнкам ёсць пляма, можна выкарыстоўваць толькі плямавыводнікі з кіслародам. Футболкі з заводскім малюнкам смела мыйце ў машыне ў рэжыме далікатнага мыцця. Але рэчы з фотапрынтамі — толькі ўручную. Аціскаць толькі рукамі, не выкручваючы. Нельга заціскаць прышчэпкамі малюнак.

*Як вывесці плямы?*

✓ Тлустая пляма. Акрамя ўсім вядомай солі, першая дапамога пры такім забруджванні — крэйда. Трэба яе растаўчы і пасыпаць пляму. Ці проста пацерці крэйдай бруднае месца. Яна ўбярэ частку тлушчу, а астатні потым лёгка адмыецца ў гарачай вадзе.

✓ Пляму ад травы можна выдаліць нават з белага адзення. Намачыце забруджанае месца спіртам або гарэлкай і пакіньце на 10 хвілін. Затым прапалашчыце рэч у халоднай праточнай вадзе і памыйце з парашком і адбельвальнікам.

✓ Пляма ад лаку і касметыкі. Найлепшы плямавыводнік пры такіх забруджваннях — вадкасць для зняцця лаку або гаспадарчы растваральнік.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.39 | 21.46 | 17.07 |
| Віцебск — | 4.20 | 21.44 | 17.24 |
| Магілёў — | 4.28 | 21.36 | 17.08 |
| Гомель — | 4.35 | 21.23 | 16.48 |
| Гродна — | 4.56 | 21.59 | 17.03 |
| Брэст — | 5.06 | 21.50 | 16.44 |

## Месяц

***Поўня 20.06—26.06.***
***Месяц у сузор'і Рыб.***

## Імяніны

***Пр.*** *Ганны, Андрэя, Арсенія, Івана, Пятра, Сцяпана.*
***К.*** *Люцыі, Элеаноры, Максіма.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

**25 ЧЭРВЕНЯ**

**1852** год — нарадзіўся Антоніа Гаўдзі, славуты іспанскі архітэктар. Гаўдзі з дзяцінства пакутаваў на рэўматызм, якія перашкаджаў яму гуляць з іншымі дзецьмі. Але хвароба не была перашкодай доўгім адзінокім прагулкам, да якіх ён меў прыхільнасць усё сваё жыццё. Абмежаваная з-за хваробы рухомасць абвастрыла назіральнасць будучага архітэктара, адкрыла яму свет прыроды, які стаў галоўнай крыніцай натхнення. Стыль, у якім тварыў Гаўдзі, адносяць да мадэрну. Аднак фактычна ў сваёй творчасці ён выкарыстоўваў элементы самых розных стыляў, творча іх перапрацоўваючы. Усяго за сваё жыццё архітэктар стварыў больш за 20 архітэктурных шэдэўраў. Многія з іх уключаны ў пералік Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Гэта і Саграда Фамілія — сабор Святой Сям'і ў Барселоне (1891-1926), і вінныя скляпы Гуэля (1895-1898), і Парк Гуэля (1900-1914), і Дом Бальё (1904-1906), і Дом Міла (1906-1910). Яго жыццё скончылася трагічна — ён трапіў пад колы трамвая каля гары Цібідаба побач з працай, на якую ён патраціў 27 гадоў жыцця, — саборам Святой Сям'і ў Барселоне. Яму было 74 гады.

Дом Бальё.

**1905** год — нарадзіўся (вёска Пуцілкавічы, цяпер ва Ушацкім раёне) Пятрусь Броўка, народны паэт Беларусі, акадэмік НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы. У 1918-1928 гадах быў на савецкай і партыйнай рабоце; адказным сакратаром газеты «Чырвоная Полаччына». У 1941-1942 гадах працаваў у франтавой газеце «За Савецкую Беларусь», супрацоўнічаў у партызанскай прэсе. У 1945-1948 гадах — рэдактар часопіса «Полымя», у 1948-1967-м — старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі, у 1967-1980-м — галоўны рэдактар «Беларускай Савецкай Энцыклапедыі». Аўтар кніг паэзіі «Пахне чабор», «А дні ідуць», «І днём і ноччу ...» і інш. Памёр у 1980 годзе.

**1941** год — 75 гадоў таму войскі 13-й арміі Заходняга фронту пачалі абарону Мінска. Ваенныя камісарыяты горада накіравалі ў войскі каля 27 тысяч мабілізаваных. 25 чэрвеня 3-я нямецкая танкавая група пад камандаваннем генерал-палкоўніка Г. Гота, якая наступала з боку Вільні, выйшла на подступы да Мінска з поўначы. 26-27 чэрвеня з брэсцкага напрамку да сталіцы Беларусі прарвалася таксама 2-я танкавая група (генерал-палкоўнік Г. Гудэрыян). У палаосе Мінскага ўмацаванага раёна на рубяжы Стайкі — Заслаўе — Дзяржынск — Станькава абараняліся войскі 64-й і 108-й стралковых дывізій, Дзяржынскі пагранічны атрад. Расцягнутыя больш чым на 100 км, яны не змаглі стварыць суцэльнага фронту, іх абарона мела характар асобных вузлоў супраціўлення на верагодных кірунках прарыву праціўніка. Найбольш зацятыя баі ішлі ў раёне вёсак Грыні, Мацкі, Ашнарова, Ломшына, Рогава, якія некалькі разоў пераходзілі з рук у рукі. У раёне Радашковічаў здзейснілі подзвігі лётчыкі капітаны М.Ф. Гастэла, А.С. Маслаў, старшы лейтэнант І.З. Прэсайзен, якія накіравалі свой падбіты самалёт-бамбардзіроўшчык на скопішча варожай тэхнікі і жывой сілы. У той жа дзень урад Беларусі пераехаў з Мінска ў Магілёў.

**Было сказана**

**Люба ТАРАСЮК, паэтка:**
*«Уся зямля — адзін стары курган,*
*Куды сышліся нашых продкаў продкі».*

## УСМІХНЕМСЯ

Варатар футбольнай каманды — трэнеру:

— Чаму вы мяне трымаеце ў запасе?

— Запас галоў не прапускае.

**Хто-небудзь! Растлумачце жанчынам, што калі ты напіўся пасля сваркі — гэта доказ кахання і душэўных перажыванняў, а не тое, што ты «алкаголік і брудная, абыякавая скаціна».**

Грузчыкі разгружаюць мэблю, лаянка стаіць незвычайная — васьміпавярховая, са складанымі канструкцыямі, незвычайнымі суфіксамі... Жанчына, якая праходзіць міма, кажа іх брыгадзіру:

— Слухайце, я чула, вядома, як людзі часам лаюцца, але каб так...

— Гэта мы аспірантаўфілолагаў на падпрацоўку ўзялі.




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ ТЭЛ./ФАКС: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.023. Індэкс 63850. Зак. № 2431. Нумар падпісаны ў 19.30 24 чэрвеня 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12